№№89—90
(2609—2610)

7 чэрвеня 2007 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай і рускай мовах

Выдавец:
УП «Народная воля».
Кошт — свабодны.

На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...
Якуб КОЛАС

Да ўвагі!

Хто не зрабіў перадаплату і хоча набываць газету ў офісе рэдакцыі — чакаем!

Наведвайце сайт «Народнай волі»!

Паважаныя чытачы "Народнай волі"!
Знайсці нас у Інтэрнеце можна па адрасе **www.nv-online.info**
Там вы зможаце прачытаць артыкулы апошніх нумароў газеты і абмеркаваць іх, даведацца пра падзеі ў краіне і свеце на стужцы навін, напісаць электронны ліст у рэдакцыю.
Архіў газеты можна паглядзець па адрасе **http://nv.promedia.by**

ПРОГНОЗ

Александр Милинкевич:

"В оппозиции сегодня серьезный кризис, глубокий кризис. Еще не смертельный, но уже такой, чтобы говорить, что это болезнь. То, что собираются осуществить по результатам этого Конкресса, я считаю делом абсолютно безнадежным. Знаю, что многим не понравятся мои слова, но я никуда не убегаю, я здесь..."

ПАЛІТЫКА

Пятая спроба...

Маладыя людзі з незарэгістраванай арганізацыі "Малады фронт" правялі паўторны ўстаноўчы сход і зноў падалі дакументы на рэгістрацыю. Лідэр арганізацыі Дзмітрый Федарук кажа, што "МФ" не збіраецца адступаць і будзе дамагацца рэгістрацыі арганізацыі любой цаной.

7 мая каля 60 маладых людзей правялі ўстаноўчы сход Мінскай гарадской арганізацыі, а ўжо 18 мая, як вядома, калегія ўпраўлення юстыцыі Мінскага гарвыканкама адмовіла ў рэгістрацыі "Маладога фронту" на той падставе, што нібыта была знойдзена неадпаведнасць пададзеных дакументаў статуту. Дзмітрый Федарук у сваю чаргу паведаміў, што са спісу заснавальнікаў арганізацыі таемным чынам знікла прозвішча Алега Корбана; усе бачылі, як хлопец ставіў свой подпіс як адзін з сузаснавальнікаў "Маладога фронту", аднак у спісах ягонага прозвішча не аказалася...

Адным словам, прэтэнзіі ўзаемныя. Але маладыя людзі вырашылі браць настойлівасцю: праводзіць устаноўчы сход — падаваць на рэгістрацыю; пры адмове — зноў праводзіць устаноўчы сход і зноў падаваць на рэгістрацыю. "Гэта добрая зброя супраць розных крымінальных спраў. Праводзім устаноўчы сход, падаём на рэгістрацыю — месяц дакументы разглядаюцца, даюць нам адказ; зыходзячы з адказу, мы плануем далейшыя дзеянні. Заадно паглядзім, чым наша юстыцыя будзе тлумачыць наступныя адмовы ў рэгістрацыі", — кажа Дзмітрый Федарук.

Гэта, дарэчы, будзе ўжо пятая спроба "Маладога фронту" зарэгістравацца.

1 чэрвеня каля 20 "маладафронтаўцаў" ізноў сабраліся вузкім колам на ўстаноўчы сход, на якім прынялі новую рэдакцыю статута — у адпаведнасці з заўвагамі ўпраўлення юстыцыі Мінскага гарвыканкама. 4 чэрвеня заснавальнікі падалі абвестку ў "Вячэрні Мінск" аб праведзеным сходзе, і гэтым жа днём чарговы раз аднеслі дакументы на рэгістрацыю Мінскай гарадской арганізацыі "Малады фронт" ва ўпраўленне юстыцыі Мінгарвыканкама. Цяпер у заснавальніках арганізацыі лічацца 15 чалавек.

Глеб ХМЯЛЬНІЦКІ.

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

Нават афіцыйны прафсаюз не задаволены

Старшыня Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі Леанід Козік накіраваў у Палату прадстаўнікоў шэраг прапаноў да законапраекта "Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Працоўны кодэкс Рэспублікі Беларусь".

Прафсаюзы заклікаюць адмавіць норму, што знікла з заканадаўства, аб выплаце выхадной дапамогі тым, хто атрымаў працоўнае калецтва або прафзахворванне, захаваць існуючыя даплаты за працу ў начны час, а таксама заканадаўча гарантаваць прадастаўленне дадатковых адпачынкаў за ненарміраваны працоўны дзень і працяглы стаж працы.

Раней выхадная дапамога ў памеры не менш за трохразовы сярэднямесячны заробак для тых, хто атрымаў працоўнае калецтва або прафзахворванне, гарантавалася законам "Аб занятасці насельніцтва Рэспублікі Беларусь". Аднак новая рэдакцыя закона гэтай нормы ўжо не ўтрымлівае.

"Грамадскасць усур'ёз занепакоена імкненнем распрацоўшчыкаў законапраекта адысці ад тэрміну "шматзменная праца" і гэтым зэканоміць на даплатах тым, хто працуе ў вячэрні час", — гаворыцца ў лісце Леаніда Козіка. Федэрацыя заклікае да захавання існуючай даплаты за працу ў вячэрні час.

Не згодныя ў ФПБ і са змяненнямі ў частцы прадастаўлення адпачынкаў. Нагадаем, што законапраектам прапануецца не толькі скараціць максімальную працягласць дадатковых адпачынкаў за ненарміраваны працоўны дзень і працяглы стаж працы, але і аднесці іх прадастаўленне на кошт уласных сродкаў наймальніка. Паводле ацэнкі Л.Козіка, гэта можа пацягнуць парушэнне прынцыпу сацыяльнай справядлівасці, таму што работнікі, якія маюць аднолькавую кваліфікацыю і раўнавартасную пасаду, будуць адпачываць роўна столькі, на колькі хопіць грошай у наймальніка.

Марына НОСАВА.

ЭШЕЛОНЫ ВЛАСТИ

Тайна ареста Александра Боровского

29 мая органами госбезопасности был задержан председатель Государственного концерна по нефти и химии "Белнефтехим" Александр Боровский

О том, что Боровского подозревают в совершении ряда коррупционных преступлений, журналистам сообщил генеральный прокурор Беларуси **Петр Миклашевич.**

"Органами госбезопасности по подозрению в совершении коррупционных преступлений задержан председатель Государственного комитета по нефти и химии "Белнефтехим" Боровский, а также ряд других руководителей государственных и коммерческих структур, — сказал генпрокурор. — *Подозреваемые задержаны и находятся в следственном изоляторе КГБ. В ходе проведения первоначальных следственных действий у подозреваемых изъяты крупные суммы денег, ценности, документы, относящиеся к расследуемым преступлениям. В настоящее время неотложные следственные действия по делу продолжаются, о результатах расследования мы будем информировать".*

Какие-либо подробности данного дела Петр Миклашевич разглашать не стал, пообещав ответить на все вопросы ровно через месяц — накануне 85-летия прокуратуры Беларуси. При этом генпрокурор добавил: *"Мы будем пресекать, выявлять все коррупционные преступления, невзирая на чины и ранги, в том числе и на самом высоком уровне".*

Как ни странно, генпрокурор — единственный, кто не сделал тайны из ареста Боровского.

Кто задержан вместе с Боровским?

Многочисленные попытки журналистов получить официальный ответ на этот вопрос не увенчались успехом.

Начальник Центра информации и общественных связей КГБ Беларуси **Валерий Надточаев** на все вопросы по делу Боровского и компании отвечает односложно: *"Без комментариев".*

Как только стало известно о задержании главы "Белнефтехима", на некоторых сайтах появилась информация об аресте известного бизнесмена, владельца фирмы "Трайпл" **Юрия Чижа.** Однако в разговоре с журналистом "Народной воли" Юрий Александрович опроверг эти слухи, заявив, что не видит оснований для своего ареста.

По информации из неофициальных источников, вместе с экс-главой "Белнефтехима" якобы был задержан и гендиректор Белорусского нефтяного торгового дома **Валерий Иванкович.** Однако уже в понедельник 4 июня он появился на работе. Правда, Валерий Валерьевич не желает ни опровергать, ни подтверждать информацию о своем задержании. Едва выслушав вопрос журналиста "Народной воли", он просто молча повесил трубку.

В чиновничьих кругах ходят разговоры о том, что правоохранительные органы в свете дела Боровского якобы заинтересовались деятельностью вице-премьера **Владимира Семашко.** Если верить кулуарной информации, то Семашко в ближайшее время может со скандалом лишиться своей должности. Стоит отметить, что пару недель назад "Народная воля" поинтересовалась у вице-премьера, не намерен ли он в ближайшее время по каким-то причинам сменить место работы. Владимир Ильич довольно оптимистично ответил: *"Менять работу не собираюсь, и мне никто ничего другого не предлагал".*

Что говорят

Экономист **Ярослав Романчук** считает, что задержание председателя концерна "Белнефтехим" не имеет ничего общего с политикой.

"Скорее всего это межклановая или межноменклатурная борьба, — анализирует Романчук. — *Кто-то оказался сильнее, и пошли "посадки". Сколько в этом деле криминала, а сколько мести — сказать сложно. Может быть, что коммерческие интересы главы "Белнефтехима" и государства пересеклись... Может, это передел рынка, но, похоже, Боровского задержали не за его призывы к приватизации отрасли".*

Руководитель аналитического центра "Стратегия" **Леонид Заико** не исключает, что махинации с нефтью и нефтепродуктами в "Белнефтехиме" могут *"измеряться миллионами".*

"Дело в том, что на нефти, на бензине миллионы можно было заработать за считанные дни, если только правильно сориентироваться в конъюнктуре рынка, — объяснял Заико журналистам. — *Купил бензин чуть подешевле, через несколько дней продал чуть подороже - и этого достаточно, чтобы стать миллионером".*

Один из сотрудников "Белнефтехима", пожелавший остаться неизвестным, сказал "Народной воле", что сегодня дело Боровского окутано такой секретностью, что *"даже трудно судить, за что именно его задержали".*

"Это могут быть и "полимировские" хвосты, и "белшиновские", и концерновские, — сказал сослуживец Боровского. — *В последнее время к Боровскому как-то странно относилось руководство страны. Заместители председателя концерна все время выступали в прессе, давали интервью, вели переговоры, а Боровский нигде не светился. За несколько дней до ареста он побывал на своей любимой "Белшине", и там публично сказал, что враги не дождутся его падения и что на осень у него якобы запланирован разговор с президентом. Кстати, Лукашенко до недавнего времени к нему вроде бы неплохо относился. Вспомните газовый кризис, когда на одном из совещаний глава государства сказал: мол, ну а по нефти как договорится Боровский, так и будет. А все высказывания Боровского были пророссийскими. Лоббировал ли он интересы каких-то конкретных компаний — неизвестно. Не исключено, что он стал жертвой подковерной борьбы".*

Из архива

Александр Боровский был назначен председателем концерна "Белнефтехим" вместо **Бронислава Сивого.** До этого он возглавлял одно из крупнейших предприятий белорусской нефтехимической отрасли — новополоцкое ОАО "Полимир".

Назначая Боровского, А.Лукашенко заявил: *"Свежий взгляд опытного человека — то, что нам нужно в такой важной сфере, как нефтепереработка и нефтехимия. Вам предстоит принести державе в течение трех месяцев до 1 миллиарда долларов дополнительно к тому, что мы имеем"*.

Разговоры о том, что председатель "Белнефтехима" Александр Боровский якобы уходит со своего поста по состоянию здоровья, появились несколько месяцев назад — через некоторое время после совещания, которое А.Лукашенко в январе провел на "Нафтане". Примерно в это же время новополоцкий сайт "Химик" опубликовал некоторые откровенные высказывания Боровского.

"Декабрь 2006 года показал, я могу открыто сказать, что с экономической точки зрения наше правительство поступило очень неправильно, — сказал Боровский на встрече с руководством "Нафтана". — *Когда Россия предложила поделить таможенную пошлину на нефтепродукты, на переговоры поехала комиссия не того уровня, в итоге мы получили неожиданно в декабре таможенную пошлину 180 у.е. Нам не дали в декабре завезти нефть, хотя мы договорились".*

Покритиковал Боровский и деятельность вице-премьера **Андрея Кобякова**, который, по словам экс-главы "Белнефтехима", после переговоров в Москве *"приехал и доложил президенту, что все хорошо, бюджет страны нормальный".*

"Когда президент вел совещание здесь (на "Нафтане", 23 января 2007 года), я тут был битой размазан об эту стенку, потому что я единственный сказал, что нужно было с Россией договариваться по таможенной пошлине и нельзя было приостанавливать подачу нефти на гомельской "Дружбе", — сказал Боровский.

Примечательно, что за три дня до задержания глава "Белнефтехима" по согласованию с первым вице-премьером **Владимиром Семашко** получил знак "Почетный химик".

День рожденья, грустный праздник...

Сегодня обязанности председателя концерна "Белнефтехим" исполняет бывший заместитель Боровского 45-летний **Владимир Волков.** Хотя на сайте "Белнефтехима" до сих пор висит информация о том, что Боровский является руководителем концерна.

Ровно через месяц А.Боровскому исполнится 56 лет. Судя по всему, отмечать свой день рождения Александр Васильевич будет в СИЗО КГБ...

Марина КОКТЫШ.

ЛИЧНОЕ ДЕЛО

А.В.Боровский родился в городе Бобруйске Могилевской области.

Трудовую деятельность начал в 1968 году рабочим.

С 1969-го по 1971 год служил в рядах Советской Армии.

С 1971-го по 1973 год работал токарем, электрообмотчиком, электромонтажником на предприятиях города Бобруйска.

1973—2001 гг. — оператор, мастер, начальник смены, старший мастер смены, заместитель начальника цеха, начальник цеха, заместитель директора, директор завода массовых шин Белорусского шинного комбината "Белшина".

В 1985 году окончил Белорусский технологический институт имени С.М.Кирова, а в 1994 году — Академию управления при Совете министров Республики Беларусь.

В 2001 году работал советником секретариата президента концерна "Белнефтехим"

2001—2002 гг. — генеральный директор Республиканского унитарного предприятия "Производственное объединение "Полимир".

С 2002-го по 2005 год — гендиректор открытого акционерного общества "Полимир".

С 2006 года — председатель Белорусского государственного концерна по нефти и химии, осуществляет общее руководство деятельностью концерна, а также непосредственное руководство управлением организационно-информационной работы и контроля, контрольно-ревизионным управлением, режимно-секретным сектором.

29 мая 2007 года взят под стражу.

ВАКОЛ ЧУТАК

Юрый Сівакоў выкладае ў інстытуце

Чуткі аб арышце былога міністра ўнутраных спраў і экс-міністра спорту Юрыя Сівакова аказаліся элементарна перабольшанымі.

Чуткі пра арышт Сівакова ўзнікаюць з нейкім неверагодным пастаянствам. Вось і на мінулым тыдні раптам пра гэта зашушукалі "людзі свядомыя". Зусім верагодна, што падставай для такіх чутак стала папярэдняя інфармацыя, што спецпадраздзяленне "Альфа" затрымала некалькі дзесяткаў чалавек з Беларускай асацыяцыі ветэранаў падраздзяленняў спецназа "Честь" (якую да нядаўняга часу ўзначальваў Юрый Сівакоў) па справе аб арганізаванай злачыннай групе. Сам Юрый Леанідавіч у каментарыі нашай газеце не адмаўляў, што ў офісе іх арганізацыі прайшоў вобыск, арыштаваны рахунак "Чести", на якім знаходзіўся 1 мільярд 900 мільёнаў рублёў і былі забраны 430 тысяч долараў ЗША. Выканаўчы дырэктар Асацыяцыі быў арыштаваны.

Сцвярджалася таксама, што Сівакова ў сувязі з апошнімі падзеямі "звольнілі" з "Чести", а яго месца заняў камандзір брыгады спецназаўцаў Дзмітрый Паўлічэнка...

— Я як пасля сыходу з пасады спартыўнага міністра пачаў працаваць у прыватным мінскім Інстытуце кіравання, так працую і па сённяшні дзень, — карэспандэнту "Народнай волі" не склала цяжкасці знайсці Юрыя Леанідавіча. — Я кандыдат юрыдычных навук, на палову стаўкі — дацэнт кафедры працоўнага і крымінальнага права, выкладаю крыміналогію і крымінальна-выканаўчае права. Так што не бачу аніякіх праблем.

— А "Честь" Вы ўзначальваеце?

— Ужо не ўзначальваю.

— Хто зараз кіруе гэтай арганізацыяй?

— Мяне на дадзены момант гэтае пытанне абсалютна не цікавіць. Ведаю толькі, што яны змянілі юрыдычны адрас

.

Алесь СІВЫ.

Хто спакусіўся на МАЗ?

Згодна з афіцыйнымі паведамленнямі, распачалася падрыхтоўка да прыватызацыі найбуйнейшага машынабудаўнічага прадпрыемства краіны — Мінскага аўтамабільнага завода. Дзяржкамітэт па маёмасці лічыць мэтазгоднымі планы па акцыяніраванні прадпрыемства. Міністэрства прамысловасці ў сваю чаргу выступае катэгарычна супраць прыватызацыі МАЗа. Тым не менш апошняе слова застаецца за Аляксандрам Лукашэнкам. Хто можа спакусіцца на МАЗ — не паведамляецца, але нейкі час таму інтарэс да прадпрыемства праяўлялі кампаніі расійскага мільярдэра Алега Дзерыпаскі.

Ул.інф.

БУДЬТЕ ГОТОВЫ!

Плата за старость

Не успели появиться первые сообщения о попытках налаживания в Беларуси производства легковых автомобилей, как стали понятны и меры, которыми правительство будет мотивировать сограждан для покупки этих авто малоизвестных марок.

Минприроды Беларуси инициирует увеличение ввозной таможенной пошлины на автомобили старше 10 лет. Параллельно ведомство предлагает уменьшить ставки пошлин для транспорта, соответствующего стандартам Евро-4 и Евро-5. Таким образом, выполнение наказа правительства — с созданием местного производства легковых автомобилей сократить ввоз в страну подержанных иномарок — началось. При этом настойчиво игнорируется одна деталь: двигатели Евро-4 и тем более Евро-5 реализуемое на внутреннем рынке топливо не выносят.

Как сообщил на пресс-конференции в Минске начальник специнспекции госконтроля за охраной атмосферного воздуха, озонового слоя и климата Министерства природных ресурсов и охраны окружающей среды Сергей Завьялов, его ведомство внесло предложение в Таможенный комитет об увеличении ввозной пошлины на автомобили старше 10 лет.

"Мы внесли предложение в ГТК об установлении на автомобили свыше 10 лет таможенной ставки в размере 2 евро за один куб двигателя. Раньше такие ставки действовали на автомобили со сроком эксплуатации свыше 14 лет", — сказал Завьялов.

Кроме того, по его мнению, на использование таких машин "в Беларуси должны действовать ограничения в массовых местах и в зонах отдыха".

Ирина МАЛЬЦЕВА.

ЖАДАЕМ ЗДАРОЎЯ!

Чаму Дзмітрыю Раку не выдзяляюць грошы?

Беларускі фрыстайліст Дзмітрый Рак, які 10 снежня атрымаў траўму галавы падчас выступлення на этапе Кубка свету ў Кітаі, пройдзе рэабілітацыю ў Маскве.

Нагадаем, што ў Мінск Дзіму прывезлі ў лютым гэтага года, пасля чаго змясцілі ў 5-ю Гарадскую клінічную бальніцу. Ужо ўвесну бацькі радаваліся — сын пачаў хадзіць, час ад часу мог нешта казаць. У красавіку Дзмітрый Рак быў пераведзены для рэабілітацыі ў Рэспубліканскую клінічную бальніцу "Аксакаўшчына", хоць сёння, па словах бацькоў спартсмена, яго неабходна перавозіць у Маскву.

"Я лічу, што "праграма" знаходжання Дзімы ў "Аксакаўшчыне" сябе вычарпала, і наўрад ці тут змогуць закончыць працэс рэабілітацыі сына, — тлумачыць Міхаіл Васільевіч, бацька фрыстайліста. — *За паўтара месяца знаходжання ў "Аксакаўшчыне" псіхатэрапеўт прыходзіў да яго ўсяго тры разы".*

Зараз Дзіма ходзіць, але толькі з падтрымкай, адзін яшчэ баіцца. Цяжка ідзе працэс фіксацыі памяці, чамусьці толькі зараз высветлілася, што ў спартсмена новае праяўленне траўмы — паражэнне вачэй.

"Сын нават нейкі час пабыў дома, але зараз менавіта з-за вачэй пераведзены ў 10-ю бальніцу, — кажа Міхаіл Васільевіч. — *Аднак гатовы хоць заўтра адправіцца ў Маскву, бо і самі медыкі сцвярджаюць, што ў такіх выпадках прамаруджванне вельмі небяспечна — аднаўленне праходзіць да года пасля траўмы".*

Немалыя грошы, якія патрэбны на знаходжанне ў маскоўскім рэабілітацыйным цэнтры (400 долараў у суткі), абяцаюць выдзеліць Міністэрства спорту і Нацыянальны алімпійскі камітэт. Акрамя таго, праводзяць дабрачынную акцыю па зборы сродкаў і самі спартсмены — грошы патрэбны не толькі для іх калегі, але і для маці, якая таксама збіраецца з сынам у Маскву і якой прыйдзецца начаваць у палаце на раскладушцы. Усе чакаюць, пакуль абяцаныя дзяржавай грошы ў рэшце рэшт з'явяцца...

Алесь СІВЫ.

Народная Воля http://www.nv-online.info
7 ЧЭРВЕНЯ 2007 г.

ЗДЗЕЛКА

“Газпром” спяшаецца

“Газпром” датэрмінова выплаціў Беларусі 625 мільёнаў долараў, выкупіўшы такім чынам у ААТ “Белтрансгаз” 12,5% акцый.

Нагадаем, падпісанне дагавора куплі-продажу акцый “Белтрансгазу” адбылося 18 мая. У гэты ж дзень дагавор быў зарэгістраваны ў Дзяржаўным камітэце па маёмасці Рэспублікі Беларусь. Згодна з дагаворам, Расія павінна была выплаціць згаданую суму на працягу найбліжэйшых 20 працоўных дзён. Грошы “Газпром” пералічыў датэрмінова.

Цяпер, паводле ўмовы дагавора, у 10-дзённы тэрмін беларускі бок перавядзе “Газпрому” 12,5% акцый. Далей на працягу 50 дзён неабходна будзе правесці сход акцыянераў, на якім у склад членаў савета сумеснага прадпрыемства будзе ўведзены прадстаўнік “Газпрома”.

Нагадаем, што спачатку беларускі бок меў на мэце аднамомантна атрымаць грошы за 50% акцый ААТ “Белтрансгаз”, але, паводле жадання “Газпрома”, выплата будзе адбывацца паэтапна на працягу найбліжэйшых трох гадоў. Кошт “Белтрансгазу” ацэнены ў 5 мільярдаў долараў ЗША. Штогод “Газпром” будзе набываць 12,5% акцый кампаніі. Такім чынам расійскі бок уступіць у правы ўласнасці і карпаратыўнага кіравання кампаніяй 1 сакавіка 2010 года, пасля таго як поўнасцю выкупіць 50% акцый “Белтрансгазу”.

Наталля КАРОТКАЯ.

ДЭМАКРАТЫЯ ПА-БЕЛАРУСКУ

Пратэстуй не пратэстуй...

Удзельнікі несанкцыянаванай акцыі супраць адмены льгот атрымалі розныя тэрміны арышту.

1 чэрвеня каля сотні маладых людзей (па інфармацыі праваахоўных органаў іх было не больш за сорак чалавек) зладзілі флэшмоб. Яго мэтай было прыцягненне ўвагі грамадскасці да скасавання льгот для шэрагу катэгорый грамадзян.

Для таго каб абазначыць сутнасць акцыі, маладыя людзі зрабілі кардонную труну, на якой было напісана толькі адно слова — “Ільготы”. Ніякіх выкрыкаў і лозунгаў у натоўпе не гучала. Але шэсце працягвалася не больш за дзесяць хвілін. Калі калона знаходзілася пад мостам у раёне вуліцы Няміга, адбыўся жорсткі разгон удзельнікаў акцыі. Найбольш актыўных міліцыянты адводзілі ў машыны. Затрымалі шасцярых. Гэта Павел Чумакоў, Вадзім Баравік, Павел Вінаградаў, Аляксандр Баразенка, Павел Вільтоўскі і Павел Маркевіч. Усіх іх абвінавацілі ва ўдзеле ў несанкцыянаваным шэсці. Мінулыя выхадныя хлопцы правялі на Акрэсціна. Суды над імі праходзілі ў судзе Цэнтральнага раёна сталіцы.

Каб падтрымаць сваіх сяброў, маладыя людзі сталі прыходзіць да будынка суда ажно з дзевяці гадзін раніцы. Аднак “падсудных” прывезлі толькі ў раёне 13.00. Людзі, што прыйшлі да будынка суда, сустракалі затрыманых воклічамі “Героі!”, “Студэнт —не злачынца, ён хоча вучыцца”.

Хутка зразумелі, што не ўсе прыйшоўшыя змогуць патрапіць у залу судовых пасяджэнняў. Таму да прысутных выйшаў чалавек у цывільным і паведаміў: “У залу трапляюць трыццаць чалавек. Перавага сваякам і журналістам. Фота- і відэаздымка падчас судовага разбіральніцтва забаронена. Так вырашыла суддзя”.

Справы маладых людзей разглядала Таццяна Паўлючук. Першым судзілі Паўла Вінаградава, які адразу заявіў, што суду не давярае, таму што лічыць, “што суддзі загадваюць зверху, як і каго караць”. Тым не менш Вінаградаў адводу суду не заявіў. Вінаватым сябе ён не прызнаў. Таму суддзя спакойна пачала чытаць пратакол, па якім абвінавачвалі хлопца. Згодна з міліцэйскімі рапартамі, Вінаградаў нёс злашчасную труну, на заўвазі супрацоўнікаў міліцыі не рэагаваў і нават штурхаў міліцыянера. Калі ў залу суда зайшоў Дзмітрый Крук — чалавек-гара, той самы, якога нібыта штурхалі, — то стала зразумела, што для таго, каб яго хоць трохі зварухнуць з месца, спатрэбяцца два ці тры такіх, як Павел Вінаградаў...

Тым не менш Таццяна Паўлючук прысудзіла Вінаградаву пяць сутак арышту. І гэта самы жорсткі прысуд з усіх, што былі агучаны ў гэты дзень. Напэўна, суддзі не спадабалася, што Вінаградаў адкрыта казаў пра тое, што суд не мае нічога агульнага з законам. Астатнія затрыманыя ўдзельнікі несанкцыянаванай акцыі атрымалі трохсутачны арышт. А Вадзім Баравік пакараны яшчэ і штрафам у 20 базавых велічынь “за непадпарадкаванне законным патрабаванням супрацоўнікаў міліцыі”.

Антон ВІТАЛЬЕЎ.

ЛІСТЫ З-ЗА КРАТАЎ

Сардэчныя праблемы ў няволі...

Пракуратура Мінска працягнула знаходжанне палітыка Андрэя Клімава за кратамі яшчэ на тры месяцы. Не зважаючы на сур’ёзнае пагаршэнне стану здароўя вязня, які дагэтуль знаходзіцца ў Рэспубліканскім турэмным шпіталі з-за праблем з сэрцам, пракуратура не палічыла магчымым змяніць зняволенаму меру стрымання.

3 чэрвеня скончыліся два месяцы, на якія затрымліваўся дэпутат Вярхоўнага Савета 13-га склікання Андрэй Клімаў з санкцыі мінскай пракуратуры. Адваката зняволены палітык не мае, у ягонай жонкі Таццяны Клімавай-Леановіч і маці Алы Клімавай надзвычай “цяжкі псіхалагічны стан”, кантактаў з іншымі сваякамі няма, таму любую інфармацыю пра Клімава даводзіцца выцэджваць па кроплі — з усіх магчымых крыніц патрохі. Дый сам зняволены апошнім часам не атрымаў ніводнай вестачкі ні ад жонкі, ні ад маці, хаця маці піша яму ледзь не штодня.

Праблемай №1 для палітзняволенага Андрэя Клімава застаецца здароўе. З яго лістоў паплечнікам стала вядома, што тэрмін утрымання за кратамі Андрэю Клімаву працягнуты яшчэ на тры месяцы. А 21 мая, знаходзячыся ў СІЗА №1, Андрэй Клімаў перанёс сардэчны прыступ. Палітык шпіталізаваны ў Рэспубліканскую турэмную бальніцу, якая знаходзіцца на тэрыторыі турмы на вуліцы Кальварыйскай у Мінску. “Яшчэ б трохі — і я загнуўся б на турэмных нарах. Але зараз трохі адышоў. Магу гуляць у дворыку бальніцы, а галоўнае, стаў спакойна спаць”, — паведаміў А.Клімаў у лісце ў прэс-службу АГП, сябрам якой палітык з’яўляецца.

Старшыня АГП Анатоль Лябедзька паведаміў, што літаральна 4 чэрвеня на офіс АГП прыйшоў другі ліст ад палітыка са шпіталю. “Надзвычай цяжкі стан здароўя. Адчуванне такое, што ў Андрэя існуюць не толькі сардэчныя праблемы. Мяркуючы па змесце ліста, здароўе надзвычай дрэннае, што выклікае велізарную занепакоенасць”, — адзначыў А.Лябедзька.

Знайсці афіцыйнае пацвярджэнне гэтай інфармацыі не ўдалося. Дзяжурны СІЗА №1 заявіў, што прэсе “такія даведкі не даюць”.

Нагадаем, што Андрэя Клімава затрымалі 3 красавіка, калі палітык дабраахвотна прыйшоў у мінскую пракуратуру спраўдзіць або абвергнуць звесткі пра ўзбуджаную супраць яго трэцюю па ліку крымінальную справу. Гэтым жа днём пракуратура Мінска прад’явіла яму абвінавачанне па артыкуле 361 Крымінальнага кодэкса — “заклікі да сілавога звяржэння канстытуцыйнага ладу, абнародаваныя праз СМІ”; мерай стрымання для палітыка абралі ўтрыманне пад вартай.

Напярэдадні незалежныя мас-медыя распаўсюдзілі інфармацыю, што пракуратура Мінска ўзбудзіла супраць яго крымінальную справу за паклёп на прэзідэнта. Аказалася, што крымінальная справа супраць Клімава была ўзбуджана пракуратурай Мінска яшчэ 28 лютага 2007 года па артыкуле 361, прычым “злачынствы” здзейснены Андрэем Клімавым нібыта “з выкарыстаннем сродкаў масавай інфармацыі”, што павялічвае тэрмін пакарання — ад двух да пяці гадоў зняволення. “Крымінальны” артыкул, з-за якога разгарэўся ўвесь сыр-бор, надрукаваны 25 студзеня 2007 года на сайце www.ucpb.org. Аднак Інтэрнет па беларускім заканадаўстве сродкам масавай інфармацыі не лічыцца.

ДАВЕДКА.

Андрэй Клімаў нарадзіўся 17 верасня 1965 года ў Мінску, па нацыянальнасці — украінец. Скончыў Львоўскае пажарна-тэхнічнае вучылішча МУС СССР у 1986 годзе; служыў у органах унутраных спраў МУС СССР (1983—1991), узначальваў малое прадпрыемства (Мінск), быў старшынёй праўлення акцыянернага таварыства “Андрэй Клімаў і К” (1991—1996).

А.Клімаў зрабіў кар’еру не толькі бізнесмена, але і палітыка. Абіраўся дэпутатам Вярхоўнага Савета 13-га склікання. Падчас асенняга супрацьстаяння 1996 года паміж Аляксандрам Лукашэнкам і Вярхоўным Саветам быў адным з сямідзесяці дэпутатаў, якія паставілі подпісы пад зваротам у Канстытуцыйны суд аб імпічменце прэзідэнту.

Мае траіх непаўналетніх дзяцей. На ягоным утрыманні знаходзіцца маці-пенсіянерка, інвалід 2-й групы.

Напісаў і выдаў некалькі кніг.

Георгій ГЛЕБУСЬ.

ДОСЬЕ

Кто способен уберечь Лукашенко?

“...Для нас совершенно ясно, кто наши враги, а кто друзья. Присутствует ли такая ясность у Лукашенко, ведь в нынешней ситуации ему нельзя даже гриппом заболеть, чтобы не получить не ту таблетку или не тот укол? Может ли он рассчитывать на свою службу безопасности, если для своих телохранителей он всего лишь “объект”, а не человек? Может ли он рассчитывать на защиту своих избирателей, если итоги голосования в их населенном пункте подводит руководитель местной администрации? Может ли он рассчитывать на справедливое решение суда, который давно принимает решения не в соответствии с законом, а по рекомендации “сверху”? Может ли он рассчитывать на человеческое обращение в белорусских тюрьмах, если работники пенитенциарной системы уже давно воспитаны на презрении к человеческому материалу, попавшему в их руки? В каком виде представят его личную жизнь работники БТ, если они даже не стесняются в дневное время транслировать порнографию, снятую скрытой камерой?

Кто же в Беларуси сегодня способен уберечь Лукашенко от произвола властей и покушений на его жизнь? Разве ответ не напрашивается сам собой — только те, для кого права человека и его жизнь представляются высшей ценностью на Земле и Вселенной. Если кто-то и заинтересован в соблюдении конституционных прав Лукашенко, так это демократическая оппозиция к нынешней власти. Только для нас не существует никаких различий между должностью и законом, между высшими интересами власти и нормами человеческой морали, между клятвой президенту и божьими заповедями. Только мы способны отвести руку наемного убийцы, не требуя взамен должностей, денег, привилегий. Только мы способны вернуть нравственные ориентиры нашему обществу, положив в основу противостояния с режимом право только на одну привилегию — отстаивать права каждого белоруса, независимо от его политической ориентации. Только мы способны беспристрастно оценить деятельность первого президента и уберечь его от линчевания своим преемником. Только мы способны вернуть ему уважение людей и обеспечить достойную старость. Только мы способны защитить его родных и близких от внесудебной расправы со стороны всех пострадавших от режима...”

(Из статьи А.Климова “Так будет у нас”).

ІНТЭРВ’Ю НА РАЗВІТАННЕ

Яраслаў і Наталля ЛУКАСІКІ:

«Усё самае лепшае ў нашым жыцці звязана з Беларуссю»

Лёс пратэстанцкага святара Яраслава Лукасіка і яго сям’і ўсхваляваў шырокую грамадскасць. Людзі тэлефанавалі са словамі падтрымкі, цікавіліся, куды дасылаць звароты з просьбай не разбіваць сям’ю святара і дазволіць яму жыць у Беларусі з жонкай і трыма дзеткамі, грамадзянамі нашай краіны.

Але рашэнне ўжо прынята: нягледзячы на звароты простых людзей, на зварот больш як сарака святароў, Лукасіку анулёваны від на жыхарства, больш за тое — уезд у нашу краіну яму, грамадзяніну Польшчы, забаронены на пяць гадоў.

Літаральна напярэдадні дня, калі Яраслаў павінен быў сесці на цягнік і з’ехаць з краіны, якая стала яму роднай, мы сустрэліся з Яраславам і яго жонкай Наталляй. Дзень расстання наступаў, на руках ужо быў квіток на цягнік, а наперадзе час, які зменіць усё жыццё гэтай сям’і... Але можна не сумнявацца, што нязменнымі для гэтых людзей застануцца каханне, гарачая вера ў Бога і любоў да Беларусі.

— Вы прыехалі ў Беларусь 14 год таму. На той час у Польшчы, напэўна, былі значна большыя перспектывы для далейшага жыцця. Тым не менш Вы прынялі такое рашэнне. Чаму?

— Так, у бацькоўскай хаце заўсёды быў дабрабыт. Бацькі і зараз жывуць у вялікім прыгожым доме на Падляшшы, ва ўсходняй Польшчы. У мяне быў някепскі “эканамічны старт”. Але я гэтым не скарыстаўся. 14 год я жыў тут, еў беларускую бульбу... І верыў, што выконваю сваё прызначэнне, якое заключаецца ў тым, каб дапамагчы людзям пазнаць Бога, пазнаць праўду.

Сэнс жыцця чалавека не ў тым, каб пакаштаваць усе гатункі каўбасы. Я веру, што сэнс жыцця ў тым, каб дапамагаць людзям і хоць трохі зрабіць лепшым гэты свет. Жыццё прыгожае тады, калі яно прысвечана шляхетным ідэалам. Мая вера, якую Бог даў мне з дзяцінства, заўсёды вучыла мяне жыць для вялікай і шляхетнай мэты.

— Што для Вас з’яўляецца гэтымі шляхетнымі ідэаламі?

— Самае першае і галоўнае — гэта пазнаць волю Бога і служыць Яму. А воля Бога заключаецца ў тым, каб жыццё людзей і жыццё народаў станавілася лепшым, каб у свеце было больш праўды, справядлівасці, больш дабрабыту. Бог хоча, каб кожны чалавек і кожная нацыя былі такімі, якімі Ён прызначыў ім быць. Таму Госпад кліча сваіх людзей змагацца з несправядлівасцю, з беззаконнем, з галечай. Людзі, якія чуюць у сэрцы гэты голас, змяняюць свет, робяць яго лепшым. Гэта і ёсць шляхетныя ідэалы.

Увогуле, дзякуючы гэтаму цывілізацыя жыла і развівалася. А калі людзі пачынаюць думаць спажывецкімі катэгорыямі, калі яны засяроджваюцца на каўбасе, — гэта самае разбуральнае як для асобы, так і для нацыі. У любыя часы знаходзяцца людзі, якія прагнуць не толькі спажываць, але таксама намагаюцца будаваць і ствараць. Я вельмі шчаслівы, што ведаю такіх людзей, што маю іх падтрымку. Мы аднолькава глядзім на сітуацыю і працуем разам.

— Вы прыехалі ў Беларусь у сярэдзіне 1990-х. Што больш за ўсё ўразіла тады, і што ўражвае зараз?

— Я заўсёды глядзеў на Беларусь праз прызму ўласнага ўяўлення. Трэба адзначыць, што гэтае ўяўленне склалася яшчэ да таго, як я ўбачыў гэтую зямлю. Я глядзеў на Беларусь як на старажытную Літву, на краіну, па якой сумаваў А.Міцкевіч, якую апісвалі Ю.Славацкі і Марыя Радзевіч. Гэтыя вялікія людзі старой культуры Рэчы Паспалітай заўсёды былі для мяне прыкладам. Чаму так? Я сам часта задаваў сабе гэтае пытанне...

Напэўна, усе гэтыя гады, нягледзячы на розныя нястачы і цяжкасці, я заставаўся тут, бо бачыў Беларусь менавіта так. Я думаю, што і Бог хацеў бы, каб Беларусь была такой.

Першы раз я сюды прыехаў у студзені 1990 года, яшчэ за савецкім часам. Мы з бацькам прыехалі да ксяндза Казіміра Свёнтэка з дапамогай беларускім каталіцкім парафіям — рэлігійнай літаратурай, літургічнымі прыладамі і іншым. Тады мы правялі тыдзень у ксяндза Свёнтэка ў Пінску. Атмасфера да 1995 года была іншая, чым зараз. Гэта была атмасфера, поўная надзеі і актыўнасці. Гэта быў час, калі будавалася нацыя. А зараз — апатыя, пасіўнасць. Як быццам час спыніўся і пайшоў назад у савецкае мінулае...

— Тое, што адбываецца з Вамі, з Вашай сям’ёй, гэта пацвярджае. Ці няма расчаравання — столькі год працы і такое заканчэнне?

— Па-першае, гэта не заканчэнне. А па-другое — я не чакаю падзякі з боку ўлад. Гэтыя ўлады стаяць на зусім іншых пазіцыях, чым стаю я. Затое я адчуваю вялікую падзяку ў сваёй душы. Я думаю, Богу падабаецца, што ўсе апошнія гады я правёў у гэтым, адным з самых складаных месцаў ва ўсёй Еўропе. Я адчуваю ўдзячнасць мноства маіх сяброў і маіх супрацоўнікоў, пастаянна атрымліваю падтрымку ад пастыраў і служыцеляў. Гэта мяне падбадзёрвае і абнадзейвае.

— Як Вы пазнаёміліся са сваёй будучай жонкай?

— Гэта вельмі цікавая гісторыя. З самага дзяцінства я вельмі люблю прыроду. З 13 гадоў я шмат часу праводзіў у пушчах, лясах Польшчы. Я вучыўся на лясніка ў Белавежы і ўсё сваё жыццё марыў жыць у нацыянальным парку. Летам 1994 года ў касцёле ў Нарачы мы арганізоўвалі маладзёжны семінар-летнік. І на гэтай зямлі, самай прыгожай па маіх уяўленнях, на Віленшчыне, я сустрэў дзяўчыну з азёрным колерам вачэй. Праз некалькі год мы пажаніліся. Раптам аказалася, што я жыву ў нацыянальным парку — Нарачанскім! Так у адначассе споўніліся мае мары...

Я вырас на ідэалах культуры, якая нарадзілася на тэрыторыі старажытнай Літвы, Беларусі. У дзяцінстве вельмі шмат чытаў А.Міцкевіча і іншых рамантычных паэтаў. Гэта сфарміравала маю жыццёвую пазіцыю, мой светапогляд і характар.

У канцы 80-х гадоў я зразумеў адну заканамернасць. Большасць самых лепшых вялікіх і выдатных дзеячаў польскай культуры і гісторыі нарадзіліся на гэтай зямлі, у іх жылах цякла беларуская кроў, яны былі беларусамі па паходжанні. Гэта А.Міцкевіч, Ст.Манюшка, М.Агінскі, Ю.Пілсудскі ды шмат іншых. Атрымалася так, што Беларусь нараджала сапраўдную польскую эліту. Іх праца будавала і фарміравала мяне.

Калі я гэта ўсвядоміў, я зразумеў, што прыйшоў час, каб аддаць тое, што палякі атрымалі, тое, што я атрымаў. Прыйшоў час, каб менавіта тут, выкарыстоўваючы гэтыя шляхетныя ідэалы і багатую культурную спадчыну, нараджаць новую эліту — маладую, хрысціянскую, беларускую.

— У Вас былі і раней праблемы з органамі дзяржбяспекі. Ці не было ідэі з’ехаць?

— Не, такіх ідэй не было. Але ціск быў. Нядаўна мне давялося пабачыць дакумент з 1998 года, дзе было напісана адносна мяне: “гражданин выдворяется принудительно, под конвоем за руководство молодежной... группировкой”. Чаму тады мяне не “выдворили”? Гэта ведае толькі Бог. Адзінае рацыянальнае тлумачэнне — за два дні да даты “выдворения” я ажаніўся з Наталляй...

Перад тым як я атрымаў від на жыхарства, спецслужбы спрабавалі мяне запалохаць. У 2001 годзе я пайшоў у пашпартны стол, а там сядзеў супрацоўнік КДБ. Тады ён мне сказаў такія словы: “Смотри, самоубийц в церкви не хоронят...”

— У адкрытым лісце, які напісала Ваша жонка ў Дэпартамент па грамадзянстве і міграцыі, яна адзначыла, што ў Вас трое дзяцей, якія выхоўваюцца на беларускай спадчыне. Следам за Вамі, зразумела, пакінуць Беларусь вымушана будзе і сям’я. Гадаваць беларусаў будзе больш складана...

— Мы будзем старацца, каб яны не забылі беларускую мову і далей выхоўваліся на той жа гістарычнай спадчыне. Нашы дзеці вельмі здольныя да моў. Старэйшы сын паралельна можа размаўляць на трох мовах, і таксама зараз вывучае чацвёртую — англійскую. У дзецях вельмі моцна закладзена свядомасць, што яны беларусы. Яны гэта кажуць з гонарам, усведамляючы сваю прыналежнасць да Беларусі. Я думаю, што гэтага нельга перакрэсліць. Гэта тое, што ў іх у крыві.

— Наталля, зараз Вы мусіце з’ехаць і пакінуць радзіму. Якія пачуцці выклікае ў Вас гэтая сітуацыя?

— Перадусім варта сказаць, што мы будзем змагацца. Мы разам з дзецьмі пакуль не з’язджаем. Мы застаемся і будзем з надзеяй чакаць суда. Мы спадзяемся, што незаконна прынятае рашэнне аб анулёўванні віда на жыхарства і рашэнне аб дэпартацыі будуць адменены. Калі суд Цэнтральнага раёна і Мядзельскі суд, дзе разглядаецца гэтая справа, не адменяць гэтыя пастановы, нам прыйдзецца з’ехаць.

Якія пачуцці? Абурэнне — сярод белага дня адбываецца беззаконне. Улада адчувае, што ёй усё дазволена, што яна ўсемагутная і што можа вырашаць лёсы людзей. Гэта мяне вельмі абурае. І адначасова ў маім сэрцы ёсць смутак, жаль і горыч, таму, што мне вельмі сумна будзе пакінуць радзіму. Тут усё маё жыццё: сябры, сваякі, мая мама. Усё лепшае, што было ў нашым жыцці, звязана з Беларуссю.

Таксама ў мяне ёсць пачуццё надзеі, бо я веру, што ўсё адбываецца пад пакровам Бога. Бог дае нам надзею, і мы верым, што беззаконне спыніцца і мы зможам вярнуцца.

Марыя САВУШКІНА.

ЭКСПЕРТЫЗА

МВФ крэдытаў нам пакуль не дасць

І папярэджвае, што восенню сітуацыя ў эканоміцы Беларусі можа значна пагоршыцца

Міжнароднаму валютнаму фонду (МВФ) пакуль не ўдаецца ўзгадніць з урадам Беларусі падыходы да макраэканамічнай палітыкі, што не дае магчымасці аднавіць перамовы аб далейшым крэдытаванні з боку фонду. Пра гэта на брыфінгу ў Мінску заявіў кіраўнік місіі МВФ у Беларусі Балаж Хорват.

Ён зазначыў, што кожная краіна — член МВФ мае права ажыццяўляць запазычанні ў фондзе, і ўмовай для выдзялення такіх крэдытаў з’яўляецца дасягненне згоды ў ажыццяўленні макраэканамічнай палітыкі. “Хаця нашы дыскусіі ва ўрадзе мелі вельмі станоўчы характар, тым не менш на гэтым этапе ў нас не існуе поўнай згоды”, — падкрэсліў Б.Хорват.

Паводле яго слоў, падчас перамоў з місіяй МВФ улады Беларусі заявілі аб магчымасці “некаторай карэкціроўкі”, у прыватнасці, урад мае намер актывізаваць прыватызацыю. Пры гэтым у МВФ асабліва падкрэсліваюць важнасць правядзення празрыстай прыватызацыі, якая будзе накіравана на павышэнне канкурэнцыі на ўнутраным рынку.

Міжнародны валютны фонд таксама занепакоены хуткім ростам унутранага попыту, які спалучаецца з дэфіцытам попыту наяўных аперацый. “Вельмі важна вырашаць праблему высокіх тэмпаў росту ўнутранага попыту шляхам больш жорсткай эканамічнай палітыкі. На нашу думку, гэта з’яўляецца ключавой праблемай, якую мы абмяркоўвалі з урадам падчас працы місіі”, — падкрэсліў Б.Хорват. Паводле яго слоў, калі эканамічная палітыка не будзе больш жорсткай, негатыўныя тэндэнцыі пачнуць праяўляцца ўжо гэтай восенню.

Аляксей АРЭШКА.

Народная Воля http://www.nv-online.info
7 ЧЭРВЕНЯ 2007 г.

ТАМ, ЗА КРАТАМІ

Замест бярвенняў Дашкевіч цягае дошкі

15 чэрвеня споўніцца дзевяць месяцаў, як лідэр незарэгістраванай арганізацыі “Малады фронт” Дзмітрый Дашкевіч знаходзіцца за кратамі.

1 чэрвеня адвакат Аляксандр Галіеў наведаў свайго падапечанага ў Шклоўскай папраўчай калоніі, дзе малады чалавек адбывае пакаранне. Дарэчы, адвакату некалькі разоў адмаўлялі ў сустрэчах з падабаронным, таму чаканне сустрэчы зацягнулася: апошняя была ў Мінску, калі Дашкевіч знаходзіўся ў бальніцы. Нагадаем, што ўрачы рэкамендавалі Дзмітрыю лёгкую працу ў сувязі з праблемамі з хрыбетнікам.

Пасля наведвання калоніі Аляксандр Галіеў паведаміў, што зараз “Дзмітрый Дашкевіч пераведзены на іншую працу — замест бярвенняў цяпер ён прымае разрэзаныя дошкі. Вось і ўся палёгка”. За гэты час лідэр “Маладога фронту” займеў на сваім рахунку 5 дысцыплінарных спагнанняў (якія, зрэшты, па словах работнікаў калоніі, тэарэтычна могуць быць зняты ў любы час). Акрамя таго, высветлілася, што Дашкевіч сур’ёзна рыхтаваўся аб’явіць галадоўку — калі б прысуд пяцярым “маладафронтаўцам”, вынесены судом Савецкага раёна Мінска 29 мая, быў іншым. Аднак суд абмежаваўся штрафамі і папярэджаннем, што і засцерагло “маладафронтаўца” ад такога кроку.

Прысуд Дзмітрыю Дашкевічу адвакат абскарджваць не збіраецца. Справа ў тым, што 15 чэрвеня спаўняецца роўна 9 месяцаў — палова тэрміну з прызначаных судом 18 месяцаў зняволення. А гэта значыць, што ў дачыненні да маладога чалавека можа быць прыменена ўмоўнадатэрміновае вызваленне. Прынамсі, Дзмітрый Дашкевіч мае на яго права. А вось прапаноў “пакаяцца”, якія паступілі ад афіцыйнага Мінска іншым палітвязням, ні асуджаны, ні ягоны адвакат не атрымлівалі.

Затое апошнім часам Дзмітрыю Дашкевічу прыйшло каля сотні папяровых жураўлікаў. Што цікава — усе жураўлікі трапілі да “маладафронтаўца” ў разгорнутым выглядзе. Акцыю ў падтрымку маладзёжнага актывіста праводзіць міжнародная арганізацыя “Amnesty International”, якая аб’явіла Дзмітрыя Дашкевіча “вязнем сумлення”: лічыцца, што папяровыя жураўлікі здольны спрыяць здзяйсненню жаданняў.

Зразумела, што жаданне ва ўсіх адно — каб Дзмітрый хутчэй выйшаў на свабоду. Што ж да самаадчування, то Дашкевіч “адчувае сябе нармальна”.

Георгій ГЛЕБУСЬ.

ПАЛІТКУХНЯ

Вячорка адкажа за акцыі, Ляўковіч — за выбары

За сустаршынямі Палітсавета аб’яднаных дэмакратычных сіл (АДС) замацаваны канкрэтныя абавязкі.

Лідэр Партыі БНФ Вінцук Вячорка будзе курыраваць інфармацыйна-мабілізацыйную работу з грамадскасцю і міжнародную дзейнасць, старшыня Партыі камуністаў Беларускай Сяргей Калякін — работу з рэгіёнамі, лідэр Аб’яднанай грамадзянскай партыі Анатоль Лябедзька — “распрацоўку пазітыўнай альтэрнатывы”, выканаўца абавязкаў старшыні Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Грамада) Анатоль Ляўковіч — выбарчыя кампаніі. Такое рашэнне прынята на пасяджэнні Палітсавета АДС.

Як паведаміла прэс-група Партыі БНФ, акрамя таго, на сваім пасяджэнні Палітсавет аднагалосна падтрымаў прапанову Партыі БНФ стварыць аргкамітэт святкавання Дня абвяшчэння суверэнітэта 27 ліпеня.

Ул.інф.

ПАДЛІЧЫЛІ

64% беларусаў хацелі б беларускамоўнага прэзідэнта

29,7% рэспандэнтаў, апытаных Незалежным інстытутам сацыяльна-эканамічных і палітычных даследаванняў (Літва) лічаць, што кіраўнік Беларусі мусіць па тэлебачанні ці радыё заўсёды выступаць па-беларуску. 34,1% мяркуюць, што ён павінен гэта рабіць час ад часу (выступаючы пры пэўных урачыстых нагодах і г.д.), яшчэ 34,3% апытаных не лічаць ужыванне беларускай мовы абавязковым.

З даследавання Цэнтра прафесара Манаева вынікае, што грамадзяне краіны падзелены па сваіх моўных прыхільнасцях на тры прыкладна роўныя групы. Адны выступаюць за тое, каб у публічнай палітыцы выкарыстоўвалася найперш беларуская мова, другія хацелі б прынамсі выразнай прысутнасці роднай мовы, трэцяя група ставіцца да моўнай праблемы абыякава.

Тым часам Аляксандр Лукашэнка наогул не гаворыць па-беларуску. Ён толькі калінікалі выкарыстоўвае беларускія словы, як правіла, у адмоўным кантэксце.

Ул.інф.

СЛЫШАЛИ?

Немножко денег из бочки «Джема»

На этой неделе началась выплата денег вкладчикам обанкротившегося “Джем-банка”.

Комиссия Национального банка по конкурсному управлению ОАО “Джем-Банк” с 4 июня 2007 года начала возвращать физическим лицам сбережения, которые они хранили во вкладах и депозитах данного банка до отзыва у него лицензий.

Удовлетворение требований других кредиторов ОАО “Джем-Банк” будет производиться в порядке очередности, установленном Законом Республики Беларусь “Об экономической несостоятельности (банкротстве)”.

Комиссия Национального банка по конкурсному управлению ОАО “Джем-Банк” расположена по адресу: г.Минск, ул.Сурганова, 28 (контактные телефоны: 219-84-21, 219-84-15).

ОАО “Джем-Банк” было зарегистрировано в Беларуси в 1991 году. Но в связи с неудовлетворительным финансовым положением, которое повлекло неисполнение им своих обязательств перед вкладчиками и иными кредиторами, у банка были приостановлены, а затем и отозваны все лицензии. Высший Хозяйственный суд Беларуси 11 мая 2007 года признал ОАО “Джем-Банк” банкротом, и в отношении его открыто ликвидационное производство.

Соб.инф.

Не видать вам долларов…

Если у вас за границей есть богатый родственник и он помогает вам, например, денежными переводами в долларах, то долларов вы не получите.

Отныне выплата гражданам денежных средств, поступающих в Беларусь по международным денежным переводам, будет осуществляться только в белорусских рублях по курсу Национального банка, установленному на дату поступления в Беларусь таких переводов и получения их национальным оператором почтовой связи. Такое решение приняли правительство и Нацбанк Беларуси в совместном постановлении Совета министров и Национального банка. Исключение составит лишь выплата денежных средств по возвращаемым переводам, которые были приняты в иностранной валюте.

Следует отметить, что Нацбанк уже высказывался в пользу подобного решения в конце прошлого — начале нынешнего года в период бешеной скупки валюты населением. Но затем по заверениям из Нацбанка ситуация стабилизировалась, и необходимость введения каких-либо ограничений якобы отпала.

Однако реальность, видимо, далеко не так безоблачна, коль все-таки пришлось идти на непопулярную меру: с валютой в стране, несмотря на бодрые заявления чиновников, туго.

Игорь МОРОЗОВ.

УРАЖАННІ

«Ты яшчэ нам адкажаш за тое, што Савецкі Саюз разбурыў…»

Як вядома, 26—27 траўня адбыўся Кангрэс дэмакратычных сіл Беларусі. На ім у якасці правамоцных дэлегатаў мелі права прысутнічаць 917 чалавек. У важнейшым фінальным галасаванні ўдзельнічалі 611. Былі вялікія надзеі на тое, што КДС вырашыць шэраг пытанняў, якія хвалююць дэмакратычную апазіцыйную грамадскасць; што ў рэшце рэшт з’явіцца магутнае аб’яднанне большасці людзей дэмакратычных перакананняў.

Многія дэлегаты, а тым больш кіраўнікі партый і грамадскіх арганізацый перакананы, што яны сваё адстаялі, перамаглі. Не здзіўлюся, калі ў бліжэйшы час з’явяцца вялікія артыкулы, у якіх будзе сцвярджацца, што на КДС самым дэмакратычным чынам прыняты змястоўнейшыя дакументы вялікай палітычнай, эканамічнай, сацыяльнай і іншай вартасці, што самым рацыянальным чынам удасканалена структура кіраўніцтва Аб’яднанымі дэмакратычнымі сіламі.

З майго пункту гледжання бачыцца іншае.

Станоўчыя моманты

Прыемна было сустрэць прадстаўнікоў усіх рэгіёнаў Беларусі, многа новых, пераважна маладых людзей, якія добра ўсведамляюць сапраўдны стан краіны і грамадства і тое, да чаго трэба імкнуцца. Цешылі зрок ўсенародна вядомыя пісьменнікі, навукоўцы, палітычныя і грамадскія дзеячы. Адукацыйнаму ўзроўню КДС мог бы пазайздросціць любы форум: дэлегатаў з вышэйшай адукацыяй была пераважная большасць і сярод іх — за 40 дактароў і кандыдатаў навук.

У адрозненне ад папярэдняга рабоце гэтага Кангрэса, які праводзіўся ў Палацы культуры Мінскага аўтазавода, ніхто не перашкаджаў. Высокага ўзроўню замежныя госці прыехалі выступіць або даслалі віншаванні, у якіх самымі цёплымі словамі віталі беларускі дэмакратычны апазіцыйны рух, заяўлялі аб сваёй з ім салідарнасці. Мноства акрэдытаваных пры КДС беларускіх і замежных журналістаў пацвярджала вялікую зацікаўленасць да працы форуму. Інфармацыйнае забеспячэнне дэлегатаў і гасцей не выклікала ніякіх нараканняў.

Арганізацыйныя хібы

На вялікі жаль, было вельмі многа чыста арганізацыйных памылак, якія прывялі для бессэнсоўнага марнавання часу: спазненне з рэгістрацыяй, два туры перарэгістрацыі з абавязковым выхадам усіх дэлегатаў з залы, арганізацыя харчавання і іншае. У выніку большасць жадаючых выступіць не атрымала такой магчымасці. Адкрытае галасаванне па даволі вялікай колькасці пытанняў з падлікам больш за шэсць соцень галасоў кожны раз губіла час і прыводзіла да памылак большых, чым сто галасоў. Непразрыстасць гэтай ардынарнай працэдуры падрывала давер да лічыльнікаў і да падліковай камісіі цалкам.

Загадзя падумаўшы, можна было пазбегнуць страт часу. Засталіся пытанні і па адным бюлетэні для патаемнага галасавання, па ўсіх без выключэння пунктах. Пасведчанні дэлегатаў — карткі высокай паліграфічнай і эстэтычнай якасці — служылі і пропускам у залу, і квітком для адкрытага галасавання. Але на першы позірк карткі дэлегатаў амаль не адрозніваліся ад пасведчанняў служб тэхнічнага забеспячэння працы КДС. Гэта прывяло да злоўжывання такімі пасведчаннямі і стала адной з крыніц грубых памылак пры падліку галасоў.

Праблемы супрацоўніцтва

Пра сказанае вышэй наўрад ці трэба было б пісаць. Але здарылася так, што як адзін з чальцоў рабочага прэзідыума я меў крэсла не сярод сваіх аднадумцаў, а наперадзе вялікай групы дэлегатаў ад ПКБ. Такое “геаграфічнае” становішча дазволіла мне многае ўсвядоміць і нават пераасэнсаваць.

Не адзін раз я пераконваў многіх, у тым ліку і сяброў Беларускага Народнага Фронту, што ПКБ катэгарычна адрозніваецца ад КПСС і КПБ, што камуністы ПКБ — сапраўдныя дэмакраты, што яны за правы чалавека і самае галоўнае — яны за незалежную Беларусь. Менавіта такія аргументы заўжды даводзіў да нас вельмі харызматычны лідэр ПКБ Сяргей Калякін, якога я шчыра паважаю і пэўны час не ўтойваў свайго жадання бачыць яго лідэрам АДС.

Пасля майго невялічкага выступлення суседзі-камуністы пачалі мяне папракаць, пасля невялічкай рэплікі — амаль што аблайваць. А калі я ўнёс прапанову не заганяць хваробу ў нутро і прапанаваў дэмакратычным чынам вырашыць пытанне аб новай структуры кіраўніцтва АДС, то дайшло і да прамых пагроз: **ты яшчэ нам адкажаш за тое, што Савецкі Саюз разбурыў!**

І стала мне сорамна і за сябе, і за сяброў па АДС. Прасцей кажучы, апрытомнеў, успомніў тых, хто не перастае нагадваць: “камуніст — ён і ў Афрыцы камуніст”. На вялікі жаль, не змяніліся метады працы і ідэалогія камуністаў. Яны па-ранейшаму тыя самыя бальшавікі, для якіх прымальныя любыя сродкі дасягнення ўласных ідэалаў, на ўзбраенні якіх па-ранейшаму крывадушша, а ўдзел ПКБ у АДС — чыста тактычны захад тыпу “супрацоўніцтва” бальшавікоў з эсэрамі перад кастрычніцкім пераваротам у 1917 годзе.

Што ж выклікала камуністычны гнеў?

Добра вядомы прынцыпы сяброўства ў АДС. Суб’екты, што ўваходзяць у аб’яднаныя сілы, маюць розныя канчатковыя мэты, па-рознаму або не зусім аднолькава бачаць уладкаванне грамадства ў рэфармаванай дэмакратычнай Беларусі. Аб’ядноўвае іх тое, што ўсе яны супраць дыктатуры і, як здавалася мне раней, усе маюць намер зрабіць абсалютна аднолькавы першапачатковы крок — ператварыць Беларусь у незалежную прававую дэмакратычную дзяржаву, унутраную і знешнюю палітыку якой будзе вырашаць усенародна абраная прадстаўнічая ўлада — у першую чаргу парламент. У склад такога парламента могуць быць абранымі прадстаўнікі розных суб’ектаў АДС. Там, у парламенце, адстойваючы праграмныя мэты сваіх партый, прыйдзецца ім шукаць узаемапрымальныя рашэнні, якія адпавядаюць памкненням большасці насельніцтва.

Перад пачаткам КДС на рэгіянальных сходах патаемным галасаваннем вырашалася пытанне, якім быць кіраўніцтву АДС. Усе без выключэння суб’екты АДС папярэдне пагадзіліся, што рашэнне рэгіянальных сходаў будзе імі выкананa. Згодна з бюлетэнямі, магло быць два варыянты:

старшынёй Палітрады АДС становіцца Аляксандр Мілінкевіч, або сустаршынямі Палітрады становяцца кіраўнікі партый і груп, якія найбольш актыўна дзейнічалі ў часы мясцовых выбараў, — В.Вячорка, С.Калякін, А.Лябедзька, А.Ляўковіч, А.Мілінкевіч.

Большасць (хаця і невялікая) выказалася за варыянт калектыўнага кіраўніцтва, і нелагічна было б спрачацца з вынікамі патаемнага галасавання, калі б не адна маленькая дэталь: Аляксандр Мілінкевіч адразу адмовіўся ад удзелу ў сустаршынстве і не даваў згоды на ўключэнне свайго прозвішча ў бюлетэнь у якасці аднаго з сустаршынь. Тым не менш варыянт калектыўнага кіраўніцтва ў бюлетэні прозвішча А.Мілінкевіча ўключаў..

Сёмы КДС быў больш прадстаўнічы, чым усе разам узятыя рэгіянальныя сходы, на якіх далёка не ўсе ўсведамлялі, за што галасуюць. У кулуарах КДС аб гэтым нямала гаварылася. Стварылася даволі няпростая сітуацыя, бо мала хто з дэлегатаў ведаў, што рэйтынг А.Мілінкевіча больш як у дзесяць разоў перавышае рэйтынг усіх астатніх разам узятых прэтэндэнтаў у сустаршыні, што ў замежжы, у дэмакратычных краінах аўтарытэт яго вельмі высокі і што менавіта з лідэрствам Мілінкевіча атаясамліваецца змаганне за незалежнасць і дэмакратызацыю Беларусі.

Каб пазбегнуць непаразумення, я прапанаваў правесці на Кангрэсе патаемнае галасаванне па тым жа практычна бюлетэні са скасаваннем прозвішча А.Мілінкевіча ў сустаршынскім варыянце. Гэту прапанову нават не паставілі на галасаванне. Для мяне асабіста важкім вынікам стаўлення да прапановы была вышэйзгаданая рэакцыя на яе камуністаў, якія запамяталі на імгненне, што яны павінны насіць маску дэмакратаў.

Высновы і спадзяванні

На Кангрэсе перамаглі тыя, каму, на іх думку, перашкаджаў Аляксандр Мілінкевіч. Беларусь, па маім перакананні, прайграла. Прайграла намаганнямі часткі кіраўнікоў сіл, што называюць сябе аб’яднанымі і дэмакратычнымі. Не збераглі мы тое, што здабылі цярпеннем, настойлівасцю, супольнай працай, мноствам сустрэч з насельніцтвам падчас паездак па Беларусі. Перамаглі прыхільнікі напісання шматлікіх дэкларацый, аматары “круглых сталоў”, зборшчыкі подпісаў у сваю падтрымку, у тым ліку і тыя, хто забываўся пры гэтым праводзіць прапагандысцкую работу з падпісантамі, перамаглі прыхільнікі стабілізацыі працэсу млявага супрацьстаяння, а не прыхільнікі выніку. Усё гэта прыкрываецца шэрагам крывадушных заклікаў аб дасканаласці распрацаванай стратэгіі дзеянняў, пошуку новых маладых лідэраў і г. д. Але ці трэба было для гэтых маладых спачатку расчышчаць месца? Не варта такімі заклікамі маскіраваць свае ўласныя амбіцыі і прэтэнзіі. Не трэба крывадушнічаць, як камуністы.

Тым не менш засмучанасць вынікамі КДС знікла ў мяне на наступны дзень, калі ў Мінску судзілі па *крымінальнай справе (!)* маладафронтаўцаў Насту Палажанку — дзесяцікласніцу, Алега Корбана, Зміцера Федарука і Барыса Гарэцкага.

Не занадта старэйшая за падсудных пракурор старалася як магла. Яна спасылалася на 8 (!) тамоў матэрыялаў следчых органаў, на забраныя ў час шматлікіх вобыскаў паперы, на раздрукоўкі падслуханых тэлефонных перагавораў, на аператыўныя відэазапісы спецслужб. Пытанні ставіла такія, як быццам перад ёй не падлеткі, у тым ліку і няпоўналетнія, а барадатыя дзядзькі з мінскага філіяла Талібана.

Адказы падсудных былі простыя: мы — за Беларусь, за хрысціянскую маральнасць і хрысціянскія прынцыпы, мы за нашу родную беларускую мову, на якой, дарэчы, хаця яна і дзяржаўная, не маглі гаварыць ні суддзя, ні пракурор, ні, як я думаю, народныя засядацелі, якія ўвесь час маўчалі. Мы, працягвалі падсудныя, хочам стварыць і падавалі дакументы на рэгістрацыю нашай арганізацыі ў Міністэрства юстыцыі, але нас не рэгіструюць. Таму мы збіраемся на кватэрах і ў кавярнях. Абмяркоўваем, што рабіць, каб нас зарэгістравалі.

У сённяшняй Беларусі такая дзейнасць лічыцца злачынствам і для барацьбы з ёй так званая палатка прыняла артыкул 193 Крымінальнага кодэкса. Пярэчанне такога артыкула Канстытуцыі нікога ў судовай і іншых абслугоўваючых уладу структурах не хвалюе.

Перакананы: лепшае сховішча для сабраных следчымі органамі матэрыялаў і доказаў — сметнік. Але ж трэба было неяк апраўдаць велізарныя затраты на “цяжкую” працу дэтэктываў, следчых, падслухоўшчыкаў, пракураў і іх кіраўнікоў. І спагнаць гэтыя сродкі ўлада захацела з маладых людзей, якімі краіна павінна ганарыцца і якім абавязана дапамагаць.

Не дзіўлюся, што ўсе гэтыя праваахоўныя органы і спецслужбы не пайшлі па старым праверaным шляху — не падкінулі ў кніжныя сумкі падлеткаў фальшывыя грошы, наркотыкі або зброю, як рабілі гэта з іншымі непаслухмянымі палітыкамі. Артыкул 193 вызваляе іх ад такой агіднай працы. Ён дазваляе асудзіць людзей без ўсялякай віны насуперак Канстытуцыі, а адказнасць за яго цалкам ляжыць на сумленні тых *“парламентарыяў”*, якія замянілі сваю чалавечую годнасць услужлівасцю перад цемрашальствам, апусціліся ніжэй мінімуму прыстойнасці.

Для роздуму

Я ўзгадваў вышэй, што ў адрозненне ад папярэдняга Кангрэса, дэлегатаў якога сустракалі правакатары і мабілізаваныя спецслужбамі правінцыяльныя акцёры ў строях геяў і лесбіянак, ніхто не рабіў ніякіх перашкод рабоце VII КДС. А вось падысці ці пад’ехаць да будынка суда над маладафронтаўцамі ўжо за гадзіну да пачатку працэсу было немагчыма з-за засілля міліцыянтаў і амапаўцаў. Каб не амбасадар ЗША спадарыня Сцюарт, амбасадар Германіі Хакер, які прадстаўляе ў Беларусі і Еўрасаюз, а таксама шэраг прадстаўнікоў іншых амбасад, то не ўпэўнены, што ў залу пасяджэння прапусцілі б некага іншага, у тым ліку і мяне.

Чаму ж улада так баіцца “Маладога фронту” і не звяртае ўвагі на КДС?

На маю думку, прадказальныя рашэнні КДС на руку ўладзе, і яна зрабіла ўсё, каб КДС не ўнёс ніякіх змен ў запланаванае. Аб’яднаная апазіцыя сама па сабе вырашыла, што не мае лідэра.

Што да мяне, да Беларускай сацыял-дэмакратычнай Грамады, да маладафронтаўцаў, пакуль пазбаўленых магчымасці афіцыйна стварыць сваю беларускую хрысціянскую арганізацыю, да многіх іншых грамадзян, партый і грамадскіх арганізацый, то для нас лідэр — Аляксандр Мілінкевіч. За ім больш, чым за любым іншым, паплечнікаў і аднадумцаў. Пры такіх абставінах пэўным партыям нават прыйшлося забараніць падтрымліваць узначальваемы Мілінкевічам арганізацыйны камітэт па стварэнні Руху “За Свабоду!” рашэннем сваіх вышэйшых органаў, бо на Кангрэсе фракцыя Мілінкевіча “За Свабоду!” аказалася непараўнальна большай за фракцыі любой з партый.

Крыху пачакаем, і далучацца да руху “За Свабоду!” і АДС, параіўшы камуністам самастойна адраджаць Савецкі Саюз.

Станіслаў ШУШКЕВІЧ, старшыня Цэнтральнай Рады Беларускай сацыял-дэмакратычнай Грамады.

ГЛАС НАРОДА

Козулин осужден по политическим мотивам

Так считают 34,9 процента опрошенных белорусов

Как и год назад, Независимый институт социально-экономических и политических исследований (Литва) провел опрос среди населения Беларуси. Среди прочих респондентам предлагалось ответить и на вопрос, за что оказался в тюрьме экс-кандидат в президенты Александр Козулин — за “злостное хулиганство, организацию и активное участие в групповых действиях, нарушающих порядок”, как посчитал суд, или “по политическим мотивам и должен быть освобожден”...

Когда с таким вопросом социологи обратились к респондентам в прошлом году, мнение опрашиваемых разделилось практически поровну. Тогда почти 40% из них согласились с тем, что Александр Козулин “осужден справедливо и должен быть наказан”, около 35% посчитали, что “он осужден по политическим мотивам и должен быть освобожден”. 20 процентов белорусов, принявших участие в соцопросе, к судьбе Козулина отнеслись безразлично. Еще 5,8% респондентов затруднились с ответом.

Прошедший год, как выясняется сейчас, внес определенные изменения в оценку приговора, вынесенного Александру Козулину. Сегодня, согласно опросу института, как и год назад, 34,9% респондентов полагают, что экс-кандидат в президенты осужден по политическим мотивам и должен быть освобожден. А вот противоположного мнения придерживается уже всего лишь четверть опрошенных — 25 процентов. Это на 15% меньше, чем было год назад. Почти на столько же увеличилось число безразличных к судьбе оппозиционного политика (32,1%). 9% опрошенных затруднились с ответом.

Социологи заметили, что ответ на вопрос зависел от политических предпочтений опрашиваемых. Как правило, те, кто доверяет Александру Лукашенко, отвечали, что приговор в отношении Козулина правильный. В свою очередь не доверяющие президенту чаще видели в приговоре факт политической расправы.

Ольга ГРИНЕВИЦКАЯ.

ТЫМ ЧАСАМ

Казуліна могуць вызваліць да 3 ліпеня

Паводле інфармацыі польскай “Газеты выборчай”, беларускія ўлады знайшлі спосаб, як вызваліць палітвязняў, чаго патрабуе Еўропа, але пры гэтым не прызнаць, што гэтыя самыя палітвязні ёсць як такія.

“Газета выборча” піша, што рыхтуецца праект указа прэзідэнта пра амністыю, прымеркаваную да 3 ліпеня, калі ў Беларусі на дзяржаўным узроўні адзначаецца Дзень Незалежнасці і Дзень Рэспублікі. На волю можа выйсці і шэраг зняволеных апазіцыянераў, у тым ліку Аляксандр Казулін, які браў удзел у прэзідэнцкіх выбарах-2006.

Але пацвердзіць гэтую інфармацыю ў Міністэрстве ўнутраных спраў Беларусі не ўдалося.

РЭГІЁН

Спынілі будаўніцтва завода

З-за запазычанасці ў 768 мільёнаў рублёў у Наваполацку спынілі будаўніцтва біямехзавода па перапрацоўцы бытавых другасных рэсурсаў.

Каб дабудаваць завод, урад рэкамендуе Віцебскаму аблвыканкаму ўзяць крэдыт, а выплачваць яго са сродкаў фондаў аховы прыроды.

Нягледзячы на тое, што горад практычна патанае ў адходах і патрэба ў такім заводзе даўно паспела, яго не могуць пабудаваць ужо чатыры гады. А ў гэтым годзе, калі падаткі, якія плацяцца ў экалагічны фонд, сталі цэнтралізавана забірацца ў Мінск, фінансаванне праекта наогул спынілася. У той жа час, згодна з кантрактам, пачало паступаць спецыяльнае абсталяванне нямецкай фірмы “Леманн”. Але ўсталёўваць яго пакуль няма куды, паведамляе Еўрарадыё.

Народная Воля http://www.nv-online.info
7 ЧЭРВЕНЯ 2007 г.

ДИСКУССИЯ

Не думаем, что очень большая разница должна быть в размере пенсий военных и гражданских лиц

Следим за обменом мнениями на страницах “Народной воли” по вопросам, связанным с пенсионным обеспечением. Есть что и нам сказать.

Что касается тех, кто раньше работал в системе МО, МВД, КГБ, МЧС, то их государство, кажется, не обидело. Хотя, на наш взгляд, стоило бы подойти к определению размера пенсий более дифференцированно. Одно дело прослужить в отдаленных гарнизонах, а другое — в военных оркестрах, военкоматах, проработать в госпиталях. А то, что у всех военных есть учения, так это не так уж и страшно. Если, не дай Бог, начнется война, так все здоровые люди встанут на защиту Отечества.

Не думаем, что очень большая разница должна быть в размере пенсий военных и гражданских лиц. Несладкий хлеб на тех же заводах и фабриках, на стройках, в колхозах и совхозах. Той же доярке приходится подниматься в четыре часа утра и идти на ферму и в холод, и в дождь.

Военные, а также сотрудники МВД, МЧС уходят на пенсию в 40—50 лет и большинство из них продолжает работать. И что характерно, с их пенсий ни рубля не берут в пенсионный фонд, а с гражданских при новом устройстве на работу идут определенные вычеты. Выходит, они, вчерашние военные, — бедные пенсионеры, а мы, гражданские, — богатые. Абсурд, не правда ли?

Нам говорят: бывшим военным пенсии выплачиваются из бюджета республики, а нам — из пенсионного фонда. Как будто это имеет какое-то значение. И там, и там деньги налогоплательщиков, то есть народные.

Чему нужно поучиться у тех, кто сегодня считается на заслуженном отдыхе, но еще вчера носил погоны, так это тому, как нужно бороться за свои права. Они за себя беспокоятся, постоянно выдвигают требования правительству. Им к Новому году не прибавили, так они вскоре своего добились, им даже компенсировали добавку за три пропущенных месяца. А нам, гражданским, обещали добавить, но уже полгода молчок. Нам раньше за год повышали три раза в среднем на 50 тысяч рублей, а им за один раз добавляют 80—140 тысяч рублей. Неужели наши профсоюзы не видят эту разницу? А почему молчат депутаты парламента? Ведь налицо несправедливость, а значит, о какой демократии можно говорить?

Мы просим редакцию “Народной воли” напечатать наше письмо, чтобы другие читатели могли также высказаться, изложить свои взгляды на проблему.

Михаил Сергеевич ЦЕЛУЙКО (37 лет стажа, 1-я сетка вредности);
Георгий Михайлович ЦЕЛУЙКО (42 года стажа, экс-директор школы);
Евгений Сергеевич ДОРОЖКО (43 года стажа, бывший машинист поезда);
Михаил Сергеевич МУРАШКО (33 года стажа, 1-я категория вредности);
Григорий Арсеньевич ПИКУЗА (43 года стажа, бывший водитель);
Сергей Владимирович ПИКУЗА (34 года стажа, 1-я категория вредности);
Николай Александрович НАЗАРОВ (43 года стажа, экс-водитель).
Всего 15 подписей.

г.Мозырь.

Поднять пенсии нужно не только бывшим директорам заводов и фабрик...

В одном из предыдущих номеров “Народной воли” прочитал, что в правительстве подумывают над тем, как поднять пенсии для бывших директоров заводов и фабрик. Это считаю, правильно. У руководителя предприятия нелегкая ноша и, отвечая за многотысячный коллектив, он должен знать, что по достижении определенного возраста государство достойно обеспечит его старость. Теперь, когда у многих бывших директоров пенсия не достигает и четырехсот тысяч рублей, назвать это хорошей заботой о людях, рабочий день которых начинался в семь утра и заканчивался поздно вечером, никак нельзя. И давно пора правительству обратить внимание на эту категорию пенсионеров.

Но только ли вчерашние директора заводов и фабрик в обиде на государство? А сколько у нас людей, пенсия которых не достигает и трехсот тысяч рублей? Нет, я не имею в виду тех, кто всю жизнь отлынивал от работы и, понятно, не имеет морального права предъявлять высокие требования к государству. Я имею в виду прежде всего тех пенсионеров, которые десятки лет отпахали на развитие страны, считались передовиками производства, других сфер, а нынче имеют, можно сказать, нищенскую пенсию. Выходя на заслуженный отдых, кое-кто получил соответствующие льготы, и это помогало сводить концы с концами. Но вот депутаты двух палат безоглядно упразднили многие льготы, а это значит, что расходы пенсионеров увеличиваются. Как выжить, если в месяц тебе приносят 250—270 тысяч рублей?

Нет, что ни говорите, а у очень многих пенсионеров, особенно тех, которые живут в городах, старость не завидная. И, думая над тем, как поднять пенсии для бывших директоров заводов и фабрик, правительству нельзя забывать и о всех остальных, у кого тяжелое положение и кто имеет полное право на большее внимание со стороны государства.

В конце концов вопрос можно ставить так: почему пенсионеры Беларуси находятся в худшем положении, чем пенсионеры Польши, Чехии, других стран бывшего социалистического лагеря? Что, наши пенсионеры хуже их работали? Не думаю. Тощий у нас бюджет — так тут претензии нужно предъявлять к тому же правительству, которое, видимо, не так компетентно управляет страной, как это делают правительства других стран.

Из уст разных демагогов можно услышать: будут и у людей нашей страны нормальные пенсии, вот только следует подождать. Сколько подождать — год, два, двадцать, сорок? Нет, друзья, не кормите соловья баснями. Человеческая жизнь коротка и, выйдя на пенсию, человеку хочется нормально пожить хотя бы несколько лет. Кем бы он раньше ни работал — директором завода, фабрики или простым токарем, сварщиком, учителем, врачом. Предлагаю правительству задуматься исходя из этих соображений, а не руководствуясь интересами узкой группы лиц.

Петр СВЕРЖИЦКИЙ, минчанин предпенсионного возраста.

МНЕНИЕ

А почему на больших реках не построить парочку гидроэлектростанций?

Правительство говорит о строительстве атомной станции. А почему бы на больших реках (Днепр, Нёман) не построить несколько малых или средних гидроэлектростанций? Стройматериалов у нас предостаточно, да и со специалистами проблем не может быть. Сколько белорусов принимало участие в возведении сибирских ГЭС! Они бы с удовольствием откликнулись на приглашение принять участие в строительстве гидростанций в родной стране.

А что касается проектов, то в Ленгипроводхозе их множество. Выбирай — и строй.

З.Р.СЕНЬКО, инженер-гидротехник, строитель Красноярской ГЭС и Братскгэсстроя, житель Мозыря.

ПРЕДЛОЖЕНИЕ

Налогоплательщик должен иметь право контроля

Интересная ситуация — налогоплательщик не может проконтролировать, как его деньги использует государство.

Да, у нас есть Комитет госконтроля. Но кого он контролирует? Те же государственные организации, учреждения. Словом, государство контролирует... государство.

А почему бы не создать какой-то контрольный орган налогоплательщиков? Кто как не они имеют право контроля за использованием тех денег, которые они перечисляют в казну!

Посмотрите на работу многих бюджетных организаций. Там, где может справиться один человек, сидят два, а то и три. Зарплату им дай, премию подбрось, отпускные и так называемые лечебные начисли вовремя... Сколько народных денег вылетает, можно сказать, в трубу...

Хотите конкретный факт? Пожалуйста.

Вот уже несколько месяцев в Минске идет реконструкция той части проспекта Победителей, которая начинается за Академией физвоспитания и упирается в кольцевую дорогу. Ежедневно мне доводится проезжать по этому маршруту два-три раза. Что я неоднократно наблюдал? Скажем, девять часов утра... В одном месте группа рабочих курит, в другом — ходит с лопатами от одного столба к другому, в третьем — один что-то делает, а пять человек возле него стоят, о чем-то болтают. А время идет. Заканчивается смена, а что сделано? Я удивляюсь, как мастера умудряются закрывать наряды? Ведь каждый норовит получить не копейки, а солидную сумму.

Даю голову наотрез: будь настоящий контроль со стороны налогоплательщиков, стоимость возведения любого объекта, реконструкции любой дороги была бы гораздо ниже, чем сейчас. Есть тут над чем задуматься. Не должен налогоплательщик кормить бездельников, тех, кто не умеет и не хочет продуктивно работать.

Не раз читал, как в США контролируется использование каждого доллара налогоплательщиков. Там все прозрачно, все доступно для общественности. Пусть попробует мэр какого-нибудь города отдать деньги на возведение маломальски важного объекта без проведения открытого тендера. Да если это случится, он тут же слетит с должности.

Нет, что ни говорите, а у нас деньги налогоплательщиков используются без должного контроля. А поэтому их всегда будет не хватать в бюджете страны.

Степан КРИВОРУЧКО, налогоплательщик.

ВАС ЦІКАВІЦЬ...

Ці не змагла б “Народная воля” змясціць інфармацыю наконт таго, колькі фермераў у суседняй Літве і колькі ў нас, у Беларусі?

Андрэй КРЫВАЛЬ. Уздзенскі раён.

Спадар Крываль!

У Літве, паводле нашай інфармацыі, прыватных землеўласнікаў налічваецца больш за 250 тысяч. Многіх з іх фермерамі можна назваць умоўна — яны маюць не па тры гектары ўгоддзяў, а ў некаторых лік ідзе на тысячы гектараў.

У нашай краіне па-ранейшаму верх бярэ калектыўная гаспадараванне, праўда, у большасці калгасы змянілі шыльды на СК (сельскагаспадарчыя калектывы). Па вялікім рахунку ўсё засталося так, як і было. Паўсюль дзейнічае права адміністрацыйнага кіравання.

А што з фермерамі? Іх усяго каля 2000. Калі параўноваць з дзевяностымі гадамі, то колькасць фермерскіх гаспадарак зменшылася прыкладна ў тры разы.

ЗАДУМАЙЦЕСЯ!

Чаго ж мы будзем вартыя без роднай мовы?

У “Народнай волі” за 4 мая змешчаны артыкул Ніла Гілевіча “Не закрануўшы галоўнага” — аб праблемах нашай роднай мовы. Я згодны з аўтарам артыкула на сто працэнтаў, што ў нашай краіне беларуская мова апынулася ў складанай сітуацыі. Сёння людзі размаўляюць пераважна на рускай альбо трасянцы. Нашу родную мову выцясняюць на ўсіх накірунках. Ці не задумацца ўсім-усім: чаго ж мы будзем вартыя без сваёй роднай мовы? Па сутнасці мы можам знікнуць як нацыя. Мы што, гэтага дабіваемся?

Кожны з нас павінен ганарыцца тым, што наша родная мова не горшая за іншыя мовы і яна нам дадзена з Божай ласкі. Нам не трэба выракацца свайго слова, сваіх гістарычных каранёў. Вось што пісаў некалі класік беларускай літаратуры Максім Багдановіч: “Жывём мы паміж палякаў і велікарусаў, народаў моцных, і маем шмат крыўды ад іх, бо ёсць велікарусы, што намагаюцца, каб мы забыліся на ўсё сваё, беларускае, выракліся яго ды ператварыліся ў велікарусаў, гаварылі б і жылі па-іхняму. Ёсць і палякі, якія таксама хочуць змяніць нас на свой капыл, каб і мы сталіся палякамі. Аглянiцеся: усё наша роднае, беларускае, марнуецца, нішчыцца, знікае, бо яго забіваюць, яго прыглушаюць, ім пагарджаюць, а чужое пануе, пышыцца, мае сабе пашану і павагу. І — хто ведае — быць можа, пройдзе колькі часу, і не пазнаем мы ані нашага краю, ані нашых дзяцей. І будзе скрозь чужое, нязвычнае, а свайго роднага — нічога”. Гэтыя словы паэта актуальны і па сённяшні дзень. Шкада толькі, што не ўсе беларусы гэта разумеюць. Максім Багдановіч ва ўвесь голас заклікаў нас не выракацца сваёй гаворкі, сваіх песняў, сваіх звычаяў, шанаваць, бараніць і дзецям сваім запавядаць усё беларускае.

Для нас сёння вельмі важна мець усё гэта на ўвазе, каб не застацца захудалым славянскім краем. Толькі тады нас будуць паважаць у свеце, калі мы самі сябе будзем шанаваць. А першы скарб, які мы павінны шанаваць, — гэта наша нацыянальная родная мова.

Чалавек, які называе нашу мову хамскай, нікчэмнай і кпіць з яе, — гэта дурны або малакультурны чалавек. Лічу, што Богу маліцца трэба на беларускай мове. Дзяцей трэба сваіх вучыць толькі на роднай мове. Бо калі будзем размаўляць на чужой мове, дык страцім сваё імя і зробімся нявольнікамі чужога духу, грунтам для чужых помыслаў.

Лічу: трэба стварыць на дзяржаўным узроўні спецыяльную структуру, якая б магла штодзённа займацца пытаннямі моўнай палітыкі, ажыццяўлення Закона аб мовах і кантролю за яго выкананнем.

Алесь ЗАРАНОК, жыхар в.Сырод Калінкавіцкага раёна.

РУБАМ!

Калі будзе адноўлена рэзідэнцыя Сапегі?

Кожны раз, калі я бываю ў пасёлку Ружаны, што на Брэстчыне, спыняюся ля колішняй магнацкай рэзідэнцыі. Яна была закладзена яшчэ ў XVI стагоддзі Львом Сапегам, які быў канцлерам Вялікага княства Літоўскага. Архітэктурнае аблічча комплексу здзіўляла многіх каралёў і нашчадкаў царствуючых дамоў Еўропы.

Толькі пасля паўстання 1830 года расійскія ўлады зрабілі ўсё, каб сусветна вядомая магнацкая рэзідэнцыя страціла сваю прывабнасць. Дынастыя Сапег была пазбаўлена права на валоданне ёю, будынкі з часам пачалі разбурацца.

Сённяшнія ўлады ўбухваюць мільёны долараў на ўзвядзенне паказушных аб’ектаў, а чаму б не ўзяцца з усёй актыўнасцю за аднаўленне таго, чым ганарыліся нашы продкі яшчэ ў далёкія-далёкія часы?

Кастусь МАЛІНОЎСКІ, аматар гісторыі. Фота Уладзіміра БАГДАНАВА.

ПАМЯТЬ

...Не один Сталин виноват

В 1938 году в застенках НКВД был замучен мой дед, который работал председателем колхоза в Витебской области. А в 1961 году пришла бумага из Москвы, что он посмертно реабилитирован.

Не исключаю, что кто-то из палачей жив до сих пор. Посмотреть бы им в глаза, сказать все, что я о них думаю. Не один Сталин виноват в репрессиях...

Иван Михайлович. Минск.

ОТ РЕДАКЦИИ

Читатели наверняка обратили внимание на подпись под заметкой — есть имя и отчество, но нет фамилии. А на конверте адрес указан так — г.Минск. Ни названия улицы, ни номера дома, ни номера квартиры.

Случайность? Видимо, другое. Страх. Не это ли является самой большой бедой нашего общества? У человека сталинская система уничтожила деда, может быть, еще кого-либо из родственников. Он страдает, переживает, хочет выразить возмущение, но боится открыто об этом сказать...

Так вот, любой диктаторский режим будет существовать до тех пор, пока у людей будет страх перед ним.

ИЗ ПИСЬМА

Сожалею и возмущаюсь

Очень сожалеем, что Вам приходится тратить столько сил, нервов и здоровья, чтобы мы могли регулярно читать “Народную волю”, быть в курсе событий, происходящих как в Беларуси, так и за рубежом.

Болею за А.Козулина. Не может не возмущать то, что таким людям, как он, не дают приложить свои знания, ум и энергию для процветания нашей страны.

Галина Семеновна БАРЫШКОВА, жительница Бреста.

ПАПЯРЭДЖАННЕ

Каб не праспаў урад...

Шаноўная “Народная воля”!

Наступіла лета, жыллёвыя праблемы менш хвалююць, чым зімой.

Але хутка праляціць цёплая пара, і высокія тарыфы па аплаце кватэры і камунальных паслуг нагадаюць пра сябе.

Вось мая “жыроўка” за студзень 2007 года. Кошт камунальных паслуг за гэты месяц вырас у параўнанні з папярэднім (снежнем 2006 года) на 30,8 працэнта, што эквівалентна 33 тысячам рублёў.

Калі такая тэндэнцыя будзе назірацца і будучай зімой, то на аплату жылля і камунальных паслуг ніякай пенсіі не хопіць. Таму ўжо сёння ўрад павінен задумацца над тым, як спыніць працэсы, якія вядуць да жабрацтва мільёны людзей.

Для пацвярджэння сваіх думак дасылаю ў рэдакцыю параўнальную табліцу, якую я сам склаў.

М.М.БАРАДЗІН, жыхар г.Мінска, пастаянны чытач “Народнай волі”.

Счет-квитанция

Площадь общая/жилая: 50,68/30,98 кв.м
Количество прожив. — 3 чел.

№	Виды услуг	Един.изм.	Количество		Рост %	Тариф		Рост %	Начислено		Рост %	Примечание
			Дек. 2006 г.	Янв. 2007 г.		Дек. 2006 г	Янв. 2007 г.		Дек. 2006 г.	Янв. 2007 г.		
1.	**Техобслуживание**	кв.м.	50,68	50,68	—	225,0	225,0	—	11403,0	11403,0	—	
2.	**Отчисл. на капрем.**	кв.м.	50,68	50,68	—	225,0	225,0	—	11403,0	11403,0	—	
3.	**Отопление**	гКал.	0,92809	1,25091	**134,8**	32460,3	36355,5	112,0	30126,08	45477,46	**151,0**	
4.	**Вода-канализ.**	куб.м	28,5	36,616	**128,5**	379,3	379,3	—	10810,05	13888,45	**128,5**	
5.	**Подогрев воды**	гКал	0,78292	1,09428	**139,8**	32460,3	36355,5	**112,0**	25413,82	39783,1	**156,5**	12,96 м^3—дек. 21,7м^3—янв.
6.	**Газ**	чел.	3	3	—	1613,6	1936,0	**120,0**	4840,8	5808,0	**120,0**	
7.	**Вывоз ТБО**	куб.м.	0,4176	0,4176		—2706,0	2706,0	—	1130,03	1130,03	—	
8.	**Обезвреж.ТБО**	куб.м.	0,4176	0,4176	—	1072,5	1072,5	—	447,88	447,88	—	
9.	**Плата за лифт**	чел.	3	3	—	1117,0	1117,0	—	3351,0	3351,0	—	
10.	**Радио**	шт.	1	1	—	419,0	460,0	**109,8**	419,0	460,0	**109,8**	
11.	**ТВ-каналы**	шт.	8	8	—	58,0	58,0	—	464,0	464,0	—	
12.	**ТВ-каналы**	шт.	21	21	—	340,0	340,0	—7	140,0	140,0	—	
	Всего к оплате							107.000,0	140.000,0	**130,8**		

Такі яна чалавек, Ада Эльеўна Райчонак

Паважаная рэдакцыя!

Дзякую за нумары “Народнай волі” за 1 і 2 верасня 2006 года.

Раней я працаваў настаўнікам рускай мовы і літаратуры ў Германавіцкай сярэдняй школе. У 1996 годзе выйшаў на пенсію. Але не сяджу без справы: працую на палову стаўкі навуковым супрацоўнікам у Музеі мастацтва і этнаграфіі. Адначасова збіраў матэрыялы для кнігі “Памяць”.

Дарэчы, у Германавічах працуюць тры музеі: школьны гісторыка-краязнаўчы, мастацтва і этнаграфіі імя Язэпа Драздовіча і прыватны літаратурна-мастацкі музей. Стваральніцай гэтых музеяў з’яўляецца былая настаўніца рускай мовы і літаратуры Германавіцкай сярэдняй школы Ада Эльеўна Райчонак. Яна арганізавала таксама музей у доме вядомага садавода Івана Паўлавіча Сікоры (вёска Малыя Алашкі, 25 кіламетраў на захад ад Шаркоўшчыны). Такім чынам А.Э.Райчонак стварыла ў раёне чатыры музеі.

Ужо больш за 10 гадоў Ада Эльеўна праводзіць рэспубліканскія пленэры мастакоў “Шляхамі Язэпа Драздовіча”. Пасля кожнага пленэра ладзяцца выставы мастацкіх твораў у Мінску, Віцебску, Полацку, у раённых цэнтрах Віцебскай вобласці. Вынікам гэтай працы стала тое, што імя Язэпа Драздовіча стала шырока вядомым. Яго імем названы вуліцы ў Мінску, Радашковічах, Маладзечне, Шаркоўшчыне, Германавічах.

Кліменцій КОЖАН, жыхар в.Германавічы Шаркоўшчынскага раёна.

ЗНАКОМЬТЕСЬ!

Новый президент Латвии

Сейм Латвии большинством голосов избрал на пост президента страны 52-летнего врача-ортопеда Валдиса Затлерса

Его кандидатуру выдвинула правящая коалиция. За него проголосовали 58 депутатов из 100. За альтернативного кандидата от оппозиции Айвара Эндзиньша отдали голоса 39 депутатов. Затлерс вступит в должность 7 июля, когда истечет второй и последний срок второго президента Латвии Вайры Вике-Фрейберги.

Новый президент относительно недавно пришел в политику, но уже успел оказаться в центре скандала: на него обрушилась критика за то, что принимал подарки от пациентов в бытность врачом — с 1994 года он занимал пост главного врача рижской Клиники травматологии и ортопедии.

На днях Затлерс признался, что принимал подарки от пациентов (это распространенная практика среди низкооплачиваемых медработников в Латвии и соседних странах), не отчитываясь о них в налоговых декларациях. О размере этих подношений он ничего сказать не мог.

Премьер Латвии Айгарс Калвитис и глава антикоррупционного бюро Алексей Лоскутов, впрочем, объявили, что закон не требует от врачей декларировать такие суммы. При этом они подчеркнули, что налицо пробелы в латвийском законодательстве, но личной вины доктора Затлерса в этом нет.

Затлерс окончил Рижский медицинский институт в 1979 году; проходил стажировку в клинике Йельского университета в США.

Он руководил клиникой травматологии и ортопедии около 12 лет и делал сложные операции. До этого, еще во времена СССР, он занимался реабилитацией пострадавших на Чернобыльской АЭС и сам участвовал в ликвидации последствий аварии.

Представитель медицинского цеха, бывший министр здоровья, автор ряда книг по истории медицины Латвии Петерис Апинис знает коллегу Затлерса еще с середины 70-х годов, когда оба, будучи школьниками, вместе развлекались в танцевальных клубах и на дискотеках.

"Валдис был очень музыкальным парнем, он играл на ударных в популярном тогда латышском вокально-инструментальном ансамбле. По окончании школы Валдис поступил в мединститут, учился блестяще, потом он еще более 10 лет повышал свою медицинскую квалификацию. Он действительно, как говорят, хирург от Бога! Он за годы своей работы травматологом-ортопедом провел тысячи операций, причем блестящих!", — отмечает Петерис Апинис.

Союз врачей Латвии выступил с официальным заявлением, в котором очень положительно отозвался о работе Затлерса как руководителя ортопедической клиники.

"Он проявил себя хорошим организатором, хорошим руководителем и хорошим менеджером. Он всегда хорошо обращался с пациентами и коллегами", — отметил глава союза Петерис Апинис.

В качестве недостатка указывают на отсутствие у него политического опыта.

Сам Затлерс, выступая перед депутатами парламента, сказал, что профессия врача научила его слушать людей. "Как доктор я принимаю несколько тысяч пациентов в год... Они рассказывают мне не только о своих недугах, но и той боли, которую они испытывают в повседневной жизни. Я впитал в себя достаточно такого рода информации, чтобы рационально относиться к интересам всех групп граждан, уважать их всех и прежде всего услышать всех".

Сергей ИВАНОВ.

КОРОТКО

Нет лучше Audi

Автомобили Audi в третий раз подряд признаны лучшими в Германии. Эта марка вновь оказалась на первом месте в полугодовом общем рейтинге влиятельного автомобильного клуба ADAC — AutoMarxX. За ней следуют BMW и Mercedes. Авторы исследования анализируют данные по 33 важнейшим автомобильным фирмам на немецком рынке. При этом учитываются самые разные факторы — от общего имиджа до надежности. На этот раз в их число впервые включили показатель выброса углекислого газа в атмосферу. По каждой из категорий составляется и отдельный рейтинг.

Украли золотую ванну стоимостью миллион долларов

Из дорогой гостиницы в японском городе Камогава неподалеку от Токио пропала золотая ванна стоимостью миллион долларов.

"Шляхам жыцця" Купалы я браў з сабою ў торбачцы на начлег, і, пакуль пасвіліся коні, каля вогнішча чытаў і перачытваў хлопцам верш за вершам, дэкламаваў пры кожным зручным выпадку. Калі пасталеў, сам захварэў на вершаскладанне. Цішком пасылаў свае вучнёўскія спробы ў Мінск і Бабруйск. У 1926 годзе з'явіліся ў друку мае першыя вершы. У 1930 годзе падаўся ў Мінск на пошукі літаратурнага шчасця.

У маленькай, напалову драўлянай сталіцы я гадзінамі таптаўся каля абшарпанага з нумарам 68 на Савецкай вуліцы Дома пісьменнікаў. Хацелася зайсці, убачыць жывых паэтаў і празаікаў, а можа, і Купалу з Коласам.

Аднаго разу на нялюднай Савецкай вуліцы кінуўся ў вочы адметны ад усіх, з кіёчкам у руцэ, у шэрым макінтошы, такой жа кепцы, сярэдняга росту, з светлым ружовым тварам, невялічкімі жаўтаватымі вусікамі чалавек. Калі наблізіўся, я ледзь не самлеў ад радасці, пазнаўшы па партрэтах Янку Купалу. Прасачыў, куды ж ён пойдзе? Так і ёсць — у Дом пісьменнікаў. Выходзіць, я не памыліўся. Ён знік у цёмным калідоры. Заходзіць у нехлямяжы "храм культуры" не адважыўся, хоць ужо быў членам бабруйскай філіі БелАППа — Беларускай асацыяцыі пралетарскіх пісьменнікаў. Пралетарыем я быў, а пісьменнікам — наўрад ці? Нечакана сустрэўшы мяне на вуліцы, мой бабруйскі знаёмы, аўтар некалькіх кніжак прозы Барыс Мікуліч завёў-такі мяне ў пісьменніцкае "гняздо".

Леваруч быў невялічкі зальчык з нізкаю сцэнаю для сходаў і спрэчак, насупраць — светлы пакой з дзвюма праседжанымі канапамі, пасярэдзіне — круглы стол з газетамі і часопісамі. У сутарэнні — пісьменніцкая сталовая. Каля дзвюх гадзін на абед збіраюцца прадстаўнікі ўсіх жанраў. Безграшовым буфетчыца Бася выдае талоны напавер. І ўсе потым расплачваліся.

На канапе збоку сядзелі Купала і некалькі маладых паэтаў. Яны чыталі свае новыя вершы. Дзядзька Янка ўважліва слухаў. Калі нешта падабалася, ківаў галавой. Хваліў Віталіна, Алеся Пруднікава, паэму "Бянгалія" Сяргея Астрэйкі. Астатнім раіў, каб у вершах не было лозунгавай траскатні, а ў кожным — свежая ўласная думка, дасканалае веданне таго, што пішаш, і дасканалая форма.

"Пісаць — гэта праца і праца, калі ўдаецца — шчаслівая катарга, а рыфмаваць "танкі і вагранкі" кожны ўмее. Давайце, хлопчыкі, лепей пройдземся на той бок вуліцы". І ўсе рушылі следам за Купалам. А насупраць пісьменніцкага дому, дзе цяпер Цэнтральная кнігарня, паміж прымітыўным кінатэатрам і домам некалькіх рэдакцый газет, тулілася піўнушка.

Былы пастарэлы спявак яўрэйскіх песень Лёва Браўн з вялікай бочкі пампаваў піва і з песнямі, прыказкамі і жартамі падаваў пенныя куфлі. Мы ўсе зайшлі следам за Купалам. Яго пазнаваў увесь горад, ён ледзь паспяваў адказваць на прывітанні незнаёмых. І тут наведвальнікі, убачыўшы Купалу, падаліся да сцяны. Лёва ўзрадаваўся: "О, о! Іван Дамінікавіч, заўсёды рады Вам. Колькі з Вамі? Восем? Люблю цотны лік", — і пачаў пампаваць куфель за куфлем пад сваю любімую песеньку "Луна, Луна, наверно ты пьяна. И скорчилась и сморщилась, ни к черту не годна".

Дапіў свой куфель і дзядзька Янка, разлічыўся за ўсіх і павёў нас далей да першага гукавога кінатэатра "Чырвоная зорка". Падышлі да касы. "Паглядзіце цудоўны фільм "Пуцёўка ў жыццё", — і падаў нам пук білетаў. "А Вы, дзядзька Янка?" — "А я ўжо глядзеў. Бывайце здаровы, хлопчыкі". І пайшоў уніз па Савецкай да сваёй Садовай вуліцы (цяпер вуліца Купалы). На месцы музея быў яго драўляны дамок, з вялікай таполяй у двары і адмысловымі кветнікамі.

Такіх паводзін было шмат. Купала любіў таленавітую моладзь. У яго заўсёды бывалі Сымон Баранавых, Уладзімір Хадыка, Зарэцкі, Валеры Маракоў... Маракова дзядзька Янка часта пакідаў у сябе начаваць, бо ён жыў далёка за горадам, у Козыраве. З вечароў і позніх пасяджэнняў Купала вёў Валерыя да сябе нанач.

Увішная, нястрымная і шчодрая Уладзіслава Францаўна, усімі любімая і самая гасцінная цёця Уладзя, кожнага ў тыя галодныя гады частавала вяндлінаю, каўбасамі (пальцам пханыя), усімі прысмакамі вясковай кулінарыі. Адкуль жа гэта бралася? Маці Купалы жыла на хутары Акопы, адна на гаспадарцы, усё, што мела, пасылала ў Мінск любімаму сыну. І Купала часта летаваў у Акопах, дапамагаў маці, пісаў вершы і паэмы. Там жа ў 1913 годзе нарадзілася несмяротная "Паўлінка" і адразу ажыла на пецярбургскай сцэне. Галоўную ролю выконвала прыгажуня Паўліна Мядзёлка, на ўсё жыццё стала лепшым сябрам Купалавага дому.

На пачатку 30-х гадоў у краіне пачалася жорсткая і шкодная барацьба, была разбурана сельская гаспадарка, а сумленныя і нястомныя хлебаробы-хлебадары з маленькімі дзеткамі і нямоглымі старымі за некалькі гадзін "ліквідаваліся як клас", з апусцелых хат і збэшчаных гаспадарак пад канвоем усе былі вывезены ў Сібір, Казахстан, на Далёкі Усход, ліквідаваны цэлыя нацыі і нацыянальнасці. Нейкаму нягодніку запарушыў вочы адзінокі хутар Акопы. Яго зруйнавалі за некалькі гадзін, ухапілі адзінокую Іванаўну — маці паэта, загналі ў этапную цяплушку. Купала даведаўся пра гора маці — сваё вялікае няшчасце, кінуўся за паратункам да старшыні ЦВК А.Р.Чарвякова і з яго дапамогай выхапіў з этапнай цяплушкі маці, забраў жыць да сябе. У яго невялічкім дамку жылі яго сёстры з дзецьмі і нават пляменнік Мядзёлкі. Усім хапала месца, хлеба і да хлеба.

На пачатку вайны Купала не здолеў угаварыць маці ехаць разам на Усход. Яна засталася. Берагчы сынавы рукапісныя скарбы. Пра трагічную гібель сына ў Маскве яна нічога не ведала, але чулае матчына сэрца-вяшчун не вытрымала прадчування бяды, і яна памерла на другі дзень пасля смерці сына — 29 чэрвеня 1942 года, пахавана ў Мінску на Даўгабродскіх кладах. На месцы Акопаў засталіся збуцвелыя штандары, але ў кожную Купалаву гадавіну на іх ляжыць мноства кветак і вянкоў.

* * *

Мяне можна папракнуць, што я нічога не кажу пра вечную Творчасць Купалы, што стала здабыткам літаратуры свету. Пра ўсё напісанае і зберажонае Купалам навукоўцы напісалі сотні аналітычных кніг, не менш абаранілі дысертацый і атрымалі вучоных ступеняў, разжавалі ледзь не кожны радок, знайшлі нават тое, што Купала і не думаў, засушылі нават цытаты. А паэзію перш за ўсё трэба чытаць, любіць і разумець сэрцам і перачытваць.

Таму я як жыццёвы сведка дазволю сабе з мноства фактаў і назіранняў расказаць яшчэ некалькі фактаў пра жыццё, паводзіны, воблік, шырыню чалавечай душы генія нашых душ, павадыра і прарока, былога, існага і будучага Купалу.

У адну з гадавін творчасці ўрад узнагародзіў Купалу легкавым "газікам". Гэта была першая і адзіная прыватная машына ў горадзе. Купала захапіўся шафёрствам. Успамінаецца, як ён заходзіў у Дом пісьменнікаў з новымі падручнікамі па аўтасправе. Вучыўся, ды так і не авалодаў. Мусіў наняць шафёра, а за руль садзіцца не адважваўся. Аднойчы ён спыніўся на рагу Ленінскай і Плошчы Волі.

На першым паверсе гатэля "Еўропа" быў вялікі пасудны магазін. Іван Дамінікавіч зайшоў туды і нечакана сустрэў маладога таленавітага хірурга Мікалая Іванавіча Бобрыка з жонкаю Кацярынай Іванаўнай. Бобрык у 1930 годзе ў 3-й клінічнай бальніцы ратаваў і загоіў рэзаную рану на жываце Купалы. У магазіне Купала ўзрадаваўся сустрэчы са сваім хірургам. Звярнуўся да Кацярыны Іванаўны: "Хачу купіць сервіз, а які не ведаю. Разлічваю на ваш густ. Паглядзіце і параіце".

Жонка доктара доўга прыглядалася, нарэшце выбрала. "Вялікі дзякуй вам", — сказаў Купала, разлічыўся ў касе, забраў загорнуты і перавязаны сервіз. "Вы дахаты?.. Тады прашу ў машыну". Кацярына Іванаўнааднеквалася, нарэшце села з мужам на задняе сядзенне, Купала — побач з шафёрам і пакупкай на каленях. Хутка прыехалі на гразкі Газетны завулак. Каля кватэры хірурга з пакункам выйшаў і Купала. "Гэта вам ад шчырага сэрца". Бобрыкі запярэчылі. "Бярыце, я ж абавязаны Мікалаю Іванавічу жыццём", — і перадаў сервіз Бобрыку, развітаўся і паехаў.

З полымя вайны цешчы хірурга ўдалося выхапіць з таго сервіза толькі чатыры чарачкі з зялёнага шкла і зберагчы іх. Толькі ў 70-я гады я выпрасіў іх і перадаў Купалаўскаму музею.

* * *

Я ў 30-я гады вучыўся ў Педінстытуце, працаваў у "Чырвонай змене", шмат пісаў, аціраўся ў знаёмых рэдакцыях, стараўся дагадзіць рэдактару, каб толькі надрукавалі. Сачыняў "турксібы", "мартэны", "вагранкі", якіх ніколі не бачыў. У новым часопісе "Беларусь калгасная" Сымон Баранавых надрукаваў мой верш "Гідраэлектрастанцыя". Каб быць "наватарам", і я яго разбіў на лесвічныя прыступкі.

Я ўгледзеў у кіёску на рагу Садовай і Савецкай доўгачаканы часопіс, купіў і тут жа чытаю свой "опус". Не заўважыў, як падышоў Купала. Павітаўся. "Дай зірнуць, чым гэта ты захапіўся". Узяў часопіс, зіркам прабегся па маіх "сечаных" радках, усміхнуўся і спытаў: "Гэта пра якую гідрастанцыю ты напісаў? Дзе яна, калі ты яе бачыў?" У мяне мову ад сораму адняло, ледзь чутна прашаптаў: "Нідзе". — "Бачу, што нідзе. Пад Маякоўскага хочаш падладзіцца? Ён чалавек таленавіты, але па яго "лесвіцах" можна пралезці толькі аднойчы, многія з іх жывуць, як і газета, — адзін дзень. І ён ачомаўся ад свайго "наватарства" і пачаў пісаць сапраўдную лірыку. Запомні: пісаць проста, як Пушкін, цяжэй за ўсё, каб кожны радок з сэрцам гаварыў". І мы разам пайшлі ў Дом пісьменнікаў. Які гэта быў гонар, калі бачаць людзі, што іду побач з Купалам.

У маі 1935 года літаратурная грамадскасць і ўся рэспубліка рыхтаваліся адзначыць, шырока і ўрачыста, 30-ю гадавіну творчасці дзейнасці Купалы. Я тады працаваў у Радыёкамітэце. Ніякага запісу тады яшчэ не было: усе гаварылі і чыталі адразу ў эфір. Музычны рэдактар, кампазітар Ісак Любан дамовіўся з Купалам і выпрасіў дазвол трансліраваць сяброўскую вячэру з Купалавай кватэры напярэдадні афіцыйнага юбілею. Апаратуру мы паставілі ў кабінеце паэта, а мікрафон — на застаўленым закусямі і рознымі пляшкамі стале ў суседняй досыць прасторнай зале. Гасцей было няшмат — некалькі паэтаў, акцёры і актрысы тэатра, які яшчэ не насіў Купалава імя. Купала сеў у тарцы стала перад светлым буфетам. Злева сеў адказны работнік ЦК, славуты рудабельскі партызан Максім Ляўкоў, праваруч — ружовенькі далікатны акадэмік Сямён Якаўлевіч Вальфсон.

Мы ўключылі мікрафон. Я абвясціў, што перадачу вядзём з таварыскай, перадюбілейнай вячэры ў доме Народнага Паэта, акадэміка, члена ўрада Янкі Купалы. Пачаліся віншаванні і тосты. Купала наліў чаркі суседзям і сабе, дзякаваў за добрыя словы. Паўзу запоўніла маладая прыгожая артыстка Вольга Уладзіміраўна Галіна. Яна натхнёна пачала чытаць Купалавы вершы. Яна прачытала лірычныя радкі:

Не глядзі на мяне, не глядзі, адыдзі.
Не чаруй так сабой і на яве, і ў сне!
Ты смяешся з мяне... дык ідзі ж, не глядзі,
Бо замучыш, загубіш навекі мяне!

Расчулены Купала гжэчна падышоў да артысткі і пад воплескі пацалаваў у шчаку. Падскочыла вясёлая і жартаўлівая цёця Уладзя, смыкнула мужа за чуб і са смехам прыгразіла не цалаваць пры людзях маладых дзяўчат. Пачаўся смех, апладысменты, часам не надта дасціпныя жарты. Прыйшлося выключыць мікрафон.

Чым больш успамінаеш, тым больш прыходзіць на памяць. Успомнілася 18 чэрвеня 1936 года. Гадзіны ў чатыры дня па радыё прагучала страшная вестка: "Памёр Аляксей Максімавіч Горкі". Я адразу памчаўся ў Радыёкамітэт. Мяне сустрэў адказны сакратар "Апошніх паведамленняў" Юрка Такарчук. "Зараз жа звязвайся з Купалам і прасі хоць некалькі слоў жалю пра такую вялікую страту. Давай!"

Я доўга ўпрошваў тэлефаністку звязаць мяне з Купалам, але тэлефон усё быў заняты. Нарэшце прабіўся і пачаў упрошваць напісаць некалькі радкоў пра смерць Горкага. Пачуўся знаёмы, замаруджаны перарывісты голас: "Цяпер, хлопча, слова не магу прамовіць, слёзы душаць". Я не пераставаў упрошваць. І пачуў праз усхліпы: "Калі так патрабуюць, заскоч заўтра зранку. Можа што і нашкрэбаю... Мне пісаць пра смерць Горкага цяжэй, чым ўласны некралог", — сказаў і павесіў трубку. Мы далёка за поўнач рыхтавалі на заўтра жалобныя перадачы.

Наступнай раніцай я пастукаўся да Купалы. Упусціла цёця Уладзя. Іван Дамінікавіч быў незвычайна прыгнечаны і падаў мне старонку з жалобным развітальным словам. "Прабач, больш не змог. Ён жа нас з Коласам першы падтрымаў у тыя змрочныя гады, калі і слова "Беларусь" не было, і я адважыўся напісаць і надрукаваць у 1908 годзе ў "Жалейцы" верш з загалоўкам "Гэта крык, што жыве Беларусь". Мы развіталіся, і я пабег у рэдакцыю і перадаў Купалавы словы ў дыктарскую, і яно некалькі разоў гучала з усіх рэпрадуктараў.

***

10 лютага 1936 года ў Мінск з Масквы гадзін у 11 дня прыйшоў спецыяльны "паэтычны" цягнік і прывёз на Усесаюзны пленум некалькі соцень выдатных паэтаў Саюза ССР і свету абмяркоўваць стан паэзіі. На вакзале іх сустракалі з аркестрам і кветкамі дзяржаўныя мужы, работнікі культуры і ўсе пісьменнікі.

Нервова чакаў сваіх многіх сяброў Купала. Спакойна хадзіў разважлівы Колас, мітусіліся ўсе маладыя. Пленум праходзіў у клубе імя Карла Маркса, амаль насупраць тэатра Янкі Купалы. Там я ўбачыў усіх славутасцей: Ціханава, Пастарнака, маладзенькага, яшчэ тады не славутага Твардоўскага, Бруна Ясенскага... На пленуме выходзіў спецыяльны выпуск "Літаратурной газеты", мастакі з натуры малявалі шаржы.

Купала быў неразлучны са сваім даўнім сябрам і перакладчыкам, даўнім паплечнікам Блока і настаўнікам Ясеніна — паэтам Сяргеем Гарадзецкім. Яго Купала забраў да сябе дадому, а на вячэру да яго збіраліся Тычына, Сасюра, Тыцыян Табідзе — усіх не пералічыш.

На пленуме былі спрэчкі, гучалі вершы. Я запрасіў да мікрафона ўкраінскага паэта Уладзіміра Сасюру, і тады ўпершыню прагучалі яго славутыя радкі: "Здрастуй, здрастуй, моя Білорусь — синеока сестра України!" Пленум гэты цягнуўся шэсць дзён, паэты выступалі на фабрыках, у інстытутах і школах. Тады мы ўпершыню пабачылі маладзенькага, доўгашыяга Міхалкова і пачулі без заіканняў яго "каронны" твор "Дзядзя Сцёпа".

Пачаліся страшныя 1936—1937 гады. Гора не абмінула і мяне. Я апынуўся у нетрах тайгі з пілою і "канадскаю" сякераю на плячы. Асабліва даліся ў знакі гады вайны. Радыё мы не чулі, газет не бачылі, але водгулле вайны даходзіла і туды, асабліва яе востра адчувалі нашы страўнікі.

І раптам улетку 1942 года да нас даляцела жахлівая вестка: "26 чэрвеня ў Маскве загінуў Купала". Гэта была страшэнная трагедыя для нашай беларускай "калоніі". Усе тайком плакалі, а ўвечары знеслі свае пайкі і кацялок вару і справілі памінкі самага дарагога паэта, кожны ўспамінаў дарагія сустрэчы. Мучыла адна думка: як і чаму ён загінуў? Дакладнага адказу і цяпер няма.

***

Пасля майго канчатковага вяртання, ачышчаны і апраўданы, я зноў "уцерабіўся" ў літаратуру.

Неяк у канцы студзеня 1960 года наш былы бабруйскі "хросны бацька" Міхась Лынькоў запрасіў да сябе Вітку, Зарыцкага і мяне ў новую кватэру на вуліцы Захарава. Як гасцюююць у такіх выпадках, ведаюць усе. Гаварылі пра літаратуру і літаратараў. Я ведаў, што Міхась Ціханавіч у 1942 годзе, наваяваўшыся, быў старшынёй Саюза пісьменнікаў і жыў у сталіцы на верхатуры гасцініцы "Масква". Маскоўскі і рэшткі беларускага Саюзаў пісьменнікаў рыхтаваліся ў сталіцы шырока адзначыць 60-ю гадавіну Янкі Купалы. Ён з жонкаю жыў у эвакуацыі ў пасёлку Пячышчы каля Казані. У чэрвені прыехаў на сесію Усеславянскага камітэта і на свой юбілей. Па Маскве былі расклеены афішы "Юбілей Купалы". Ён таксама пасяліўся ў "Маскве" і зайшоў да Лынькова атрымаць прадуктовыя карткі. Міхась Ціханавіч прапанаваў разам павячэраць. "Не, дзякую, Міхасёк, у мяне ў нумары ўжо стаіць вячэра, а я качаю даўняга сябра — мастака Елісеева". Узяў карткі і выйшаў.

Лынькоў дакараў сябе, чаму не правodзіў да лесвіцы. Праз некалькі хвілін пачуліся крыкі, шум, мітусня — упаў з пляцоўкі і разбіўся Купала. Зацікаўленыя схаваць канцы трагедыі пусцілі чуткі пра самагубства. Глупства! Чакаючы госця і прыехаўшы на юбілей і пэўныя ўзнагароды, мог такое ўчыніць толькі вар'ят. Толькі не Купала.

Праз шмат гадоў вядомы кінасцэнарыст і празаік Аляксей Каплер у адным Доме творчасці ўспамінаў і расказаў мне, што ён якраз 28 чэрвеня паднімаўся па гасцінічнай лесвіцы да свайго знаёмага і раптам у пралёце праляцеў чалавек, а яго адзін туфель упаў на прыступку.

У 1962 годзе урну з прахам Купалы вырашылі пахаваць у Мінску на "Вайсковых могілках". Перазахаванне было прызначана недзе на 15—16 гадзін. Да могілак сабраўся вялікі натоўп людзей, выхаваных на паэзіі Купалы. З жалем даведаліся, што некалькі наменклатуршчыкаў з кіруючым В.Ф.Шаурам ужо цішком пахавалі урну на тым месцы, дзе цяпер стаіць помнік Купалу.

Няшмат яму помнікаў у Беларусі. А вось за акіянам, у амерыканскім Ароупарку бюст Купалы стаіць побач з бюстам выдатнейшых паэтаў свету — Пушкіна, Міцкевіча, Шаўчэнкі. І будзе стаяць вечна побач з помнікамі ўладарам духу чалавецтва наш Купала.

Купала наш. Купала — наш гонар, наша вечнасць. Тыя, што бэсцілі яго, даўно забытыя ўсімі.

Купала — вечны падарожнік, павадыр відушчых, сляпых і глухіх з пакалення ў пакаленне да шчасця.

Несмяротнаму сыну душы беларускай вечная памяць і вечная слава.

Даруйце мне шматслоўе, але гэта толькі частачка таго, што зберагла памяць і легла на гэтыя старонкі, каб не знікнуць зусім.

Беражыце, шануйце і любіце Купалава слова, каб яно пераходзіла з душы ў душу, з веку — у век.

Сярэдзіна чэрвеня 2002 года.



БІБЛІЯТЭКА

Колас, якога вы яшчэ не ведалі...

У Дзяржаўным літаратурна-мастацкім музеі Якуба Коласа адбылася прэзентацыя першага тома 20-томнага збору твораў класіка беларускай літаратуры Якуба Коласа.

Галоўны навуковы кансультант выдання, член-карэспандэнт Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, супрацоўнік акадэмічнага Інстытута літаратуры імя Янкі Купалы Міхась Мушынскі паведаміў, што ў першы том, які выйшаў у сталічным выдавецтве "Беларуская навука", увайшлі вершы паэта 1898—1910 гадоў, навуковыя каментарыі да іх, аўтарскія рэдакцыі і варыянты гэтых твораў, а таксама раннія вершы Я.Коласа на рускай мове. Паводле слоў вучонага, крыніцай для вызначэння дакладнага аўтарскага тэкста і датавання твораў сталі матэрыялы з уласнага архіва нашчадкаў Я.Коласа, фондаў музея, Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, архіва бібліятэкі Інстытута літаратуры, а таксама фондаў Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва.

"Упершыню ў збор уключаны 13 вершаў ранняга перыяду, што не ўваходзілі ў папярэднія зборы твораў Коласа. У шасці вершах упершыню прадстаўлены аўтарскі тэкст, скажоны ў свой час па цэнзурных меркаваннях, а таксама адноўлены шматлікія тэксталагічныя нюансы, што раней не ўлічваліся і не публікаваліся", — сказаў вучоны.

Паводле слоў загадчыка аддзела тэксталогіі і навуковых выданняў Інстытута літаратуры, кандыдата філалагічных навук Тэрэзы Голуб, падрыхтаваны да выдання другі і трэці тамы збору, у якія адпаведна ўвойдзе паэзія Я.Коласа 1911—1938 гадоў і 1939—1945 гадоў. *"Сёлета плануецца выпуск шасці тамоў збору з усёй паэзіяй Коласа і яго малафарматнымі празаічнымі творамі"*, — сказала Т.Голуб. Яна мяркуе, што выданне стане асновай для падрыхтоўкі ў будучым поўнага збору твораў Якуба Коласа.

Варта зазначыць, што апошні акадэмічны 14-томны збор твораў Я.Коласа выдаваўся ў 1972—1978 гадах.

Марат ГАРАВЫ.

ВІНШУЕМ!

Сяброў «Народнай волі» прынялі ў пісьменніцкі саюз!

Хіба не радасная навіна? Адначасна і аднадушна, на адным пасяджэнні Рады Саюза беларускіх пісьменнікаў двое сяброў нашай газеты прыняты ў гэты творчы саюз! Адзін з іх — герой публікацыі "Ты мне вясною прыснілася...", аўтар верша да знакамітага "песняроўскага" шэдэўра **Міхась ШУШКЕВІЧ.** *Другі — вядомы па шматлікіх публіцыстычных і паэтычных выступах ветэран Айчыннай вайны са Слаўгарада* **Фелікс ШКІРМАНКОЎ.**

Выходзіць, "Народная воля" робіцца "кузняй" пісьменніцкіх кадраў? Шчыра віншуем Міхася Восіпавіча і Фелікса Уладзіміравіча (упэўнены, да рэдакцыі далучаюцца і чытачы газеты) з гэтай знакавай падзеяй, зычым здароўя на доўгія гады і нязгаснага творчага імпэту!

Што нашы пажаданні ўжо "выконваюцца", сведчыць дасланая падборка новых вершаў аднаго з "віноўнікаў урачыстасці" — Ф.Шкірманкова.

Я знаю

Намнога б мне лягчэй жылося,
Каб так, як большасць, я маўчаў
І што ў краіне адбылося,
Усё пакорліва прыняў.

Але не змог, бо адчуваю:
Павінен людзям ў гэты час
Сказаць, што шчыра ім жадаю
Усё убачыць без прыкрас.

І больш ні слова. Няхай самі
Усё зразумеюць — не маўчаць,
Калі кранае іх, што з намі
Ніхто не хоча сябраваць.

Бог сваёй ласкай да адчаю
Не даў мне ў змрочны час дайсці,
Таму цяпер я цвёрда знаю,
Куды і з кім далей ісці.

Пакуль душа не адляцела

Калі адчуеш, што гатоў
Ва ўсіх грахах сваіх прызнацца,
То гэта значыць — час прыйшоў
Перад сабой паспавядацца.

Бо там, куды твая душа
У свой дзень адыдзе
без спазнення,
Усё вядома пра цябе,
пра ўсе жыцця твайго імгненні.
Схлусіць табе там не дадуць,
Ніякі блат не дапаможа.
Усё па палічках раскладуць,
Па справядлівасці, прыгожа.

Таму прыпомні, дзе хлусіў,
І паспрабуй прызнацца смела
Сабе, што брыдкага зрабіў,
Пакуль душа не адляцела.

Прызнанне

Ты ад сваіх сыноў не адракалася,
І я ніколі ад цябе не адракусь.
Ты для мяне на ўсё жыццё засталася
Святыняй роднай, Беларусь!

Калі з табой я быў разлучаны
Вандроўкамі на доўгія гады,
А лёс мой дэтэктывам быў закручаны,
Мы разам заставаліся й тады.

І зараз, калі ты на раздарожжы
І шлях шукаеш, па якім пайсці,
Я у тваім цярністым падарожжы
Гатовы да канца з табой ісці.

Я знаю, што ніякія сумненні,
Спакусы, хцівасць прывідаў былых
Не змогуць нават на адно імгненне
Адняць пачуццяў любасных маіх.

Паэт ад Бога

Аднойчы захацеў вядомага Паэта
Ухалуі запалучыць уладар.
Ён спадзяваўся, што Пясняр за гэта
Аддасць яму свой Божы дар.

Што ні рабіў — Паэт не пагаджаўся,
Ўнястачы жыў ды як хацеў спяваў.
Ён годнасць захаваў і сам сабой
застаўся,
А талент свой юрліўцу не прадаў.

Раз'юшаны ўладар, адпомсціць
каб Паэту,
Загад аддаў склікаць з усіх куткоў
Тых, хто яго, уладарову мэту —
Раскрыжаваць Паэта — быў гатоў.

Іх назбіралася не вельмі многа.
Але знайшліся. Нават быў і той,
Каму ў свой час Паэт ад Бога
Не даў загінуць, разлучыў з бядой.

Але над талентам ахова Бога.
Яна брыдотнікам зло здзейсніць
не дае.
І застаецца ім у небыццё дарога —
Паэт жа ў велічы над імі паўстае.

Фелікс ШКІРМАНКОЎ,
інвалід Вялікай Айчыннай вайны,
сябра Саюза беларускіх пісьменнікаў.

ХАЧУ ВЕДАЦЬ...

Уключыш радыё — і ледзь не штодня табе дзяўбуць: "Линия Сталина", "Линия Сталина"... "Важнейший объект патриотического воспитания, притягательный для множества экскурсантов и туристов" і г.д. А насамрэч, што гэта такое — у гістарычным плане і цяпер? Хацелася б пачуць думку дасведчанага гісторыка, пэўна, гэта цікавіць не толькі мяне.

Б.СТАРЫКЕВІЧ, мінчанін, чытач "Народнай волі".

Дык што гэта такое — «Линия Сталина»?

Под Заславлем восстановлен фрагмент полосы укреплений образца 1930-х гг. минувшего столетия, окрещенной "Линией Сталина". Торжественное открытие историко-культурного комплекса в виде четырех инженерных сооружений с системами вентиляции, выброса пороховых газов, водяного охлаждения пулеметов и т.д. состоялось 30 июня 2005 года. Его сопровождало театрализованное представление "Нашествие", которое в том же варианте было разыграно и 22 июня 2006 года в день 65-й годовщины начала Великой Отечественной. Добровольцы в форме красноармейцев и фашистов играли в войну. Такое же театрализованное представление было разыграно и в феврале 2007-го. Победили, разумеется, "наши"...

Многие задумываются, зачем создана эта "Линия Сталина"?

Об этом — беседа корреспондента "Народной воли" с известным историком ***Игорем КУЗНЕЦОВЫМ.***

— По мнению ряда историков, "Линия Сталина" 30-х годов была провальным проектом, так и не ставшим барьером на пути немецкой армии.

— В сущности, "Линии Сталина" не было — была создана система укрепрайонов. Строительство, начавшееся в 1933 г., было в основном закончено к сентябрю 1939 года. Укрепрайоны не образовывали сплошной линии обороны. Совершенно неправильно сравнивать эту систему с линиями Зигфрида, Мажино или Маннергейма. Когда Западная Украина и Западная Беларусь были включены в состав СССР, новая граница СССР прошла в районе Бреста и Гродно. И командование Западного особого военного округа получило приказ о демонтаже возведенных оборонительных рубежей...

Неудивительно, что с началом Великой Отечественной войны путь от Бреста до Минска немецкая армия преодолела за четверо суток, почти не встретив организованного сопротивления. Оно было разве что со стороны 100-й стрелковой дивизии в районе Острошицкого Городка. Еще были стычки передовых немецких частей с красноармейцами, пытавшимися хоть как-то организовать оборону. Те, кому тогда удалось избежать смерти, прятались в полуразрушенных дотах "Линии Сталина".

— В одной из публикаций приводятся фрагменты допроса гитлеровского лейтенанта Бема, плененного в начале войны: *"Вместо мощных линий укреплений, которые мы ожидали встретить, находили только разрозненные бетонные сооружения, в некоторых местах недостроенные. Мы долго не могли поверить, что это та самая неприступная линия старой границы".* Что же представляла собой "Линия Сталина" перед войной?

— Она строилась на уровне фортификаций Первой мировой войны. Доты создавались, как правило, на равнинной местности, их можно было обойти и блокировать, а гарнизоны уничтожить несколькими гранатами. В сочетании с минными полями, заграждениями из колючей проволоки, противотанковыми рвами это действительно могло бы стать серьезным препятствием. Но к июню 1941 г. ничего из перечисленного уже не было. Если предположить, что линия была законсервирована (как сообщило Белорусское телевидение) и занята нашими войсками, то немецкие части были бы остановлены хотя бы на несколько суток.

— Соответствует ли нынешний историко-культурный комплекс тому, что строили до войны?

— То, что создано на территории в 40 гектаров, можно, пожалуй, назвать шоу-представлением "Война, которой не было". Единственная реальность — наличие дотов. Было бы честнее указать, что восстановлен фрагмент Минского укрепрайона по состоянию на осень 1939 года, а не на июнь 1941-го.

К началу войны доты были без вооружения и боеприпасов. Многие — взорваны, а то и отданы колхозам для использования под хранилища сельхозпродукции. Картинки, которую показало телевидение, — с телефонами и автономным источником водоснабжения, в реальности не было. И противотанковые "ежи", установленные под Заславлем, появились позже.

Если придерживаться правды, то следовало в полуразрушенный дот поместить "раненых красноармейцев", вооруженных винтовками. Вместо этого устроили недостоверный спектакль, вручив "немцам" автоматы, хотя у вермахта в ту пору были в основном винтовки и карабины.

— А как Вы объясните сегодняшнюю популяризацию в Беларуси имени Сталина? Оно восстановлено на стенах Суворовского училища в Минске. Недавно вышла книга "Сталину, Европа, поклонись!". А теперь еще и "Линия Сталина" на пике пропаганды.

— Этот процесс начался в начале 1990-х гг. Тогда перестали изучать историю сталинских репрессий, заговорили, что, мол, не сам вождь был "нехорошим", а его окружение. К таким явно сомнительным ценностям обращаются, когда есть нужда в исторических параллелях.

— Вам известно, как "Линия Сталина" получила свое название?

— Так ее называли Геббельс и ряд высших чинов вермахта. Да и то потому, что враги придавали слишком большое значение несуществующим вещам. "Линия" была уничтожена еще до наступления гитлеровских войск. А в нашей стране о ней вообще ничего не знали: строительство шло тайно. Полистайте научную литературу — нигде нет такого термина! Складывается абсурдная ситуация: объект называют так, как его называла нацистская прапаганда.

— Для чего может быть нужна реконструкция "Линии Сталина"?

— Как объявлено в официальных СМИ, "для воспитания молодого поколения на подвиге старшего". Покажут ее и туристам. Не удивлюсь, если иностранцам предложат за большие деньги поучаствовать в шоу с "наступающими немцами".

Знатоки истории не могут не заметить расхождения некоторых "экспонатов" с действительностью. Наши организаторы додумались нарисовать немецкие кресты на 122-миллиметровых гаубицах "Акация", которые находятся на вооружении современной белорусской армии. Это нормально? Сказали бы, что немецких танков у нас нет, и сделали бы муляжи из фанеры. Честно было бы. А недавно здесь установлен еще и памятник И.Сталину, "благодаря" которому Красная Армия понесла огромные невосполнимые потери в начальный период войны.

— Если говорить о советской истории, то какие объекты Вы бы порекомендовали реконструировать?

— Заниматься активным восстановлением, по-моему, нецелесообразно и накладно. У нас уже есть впечатляющие комплексы: "Хатынь" и "Брестская крепость-герой". Но до сих пор мы не захоронили всех погибших: более полумиллиона советских воинов лежат в бывших окопах, на полях сражений на нашей земле. И вот появилась эта "Линия", которая, похоже, служит не столько памяти, сколько, по всей видимости, коммерции...

НАДЗВЫЧАЙНАЯ СІТУАЦЫЯ

МНС закрывае аздараўленчыя лагеры

83 пастановы аб магчымым закрыцці летніх аздараўленчых лагераў вынесена органамі дзяржаўнага пажарнага нагляду. Пра гэта на прэс-канферэнцыі ў Мінску паведаміў начальнік упраўлення нагляду і прафілактыкі МНС Сяргей Паланевіч.

Паводле яго слоў, пастанова органаў МНС аб закрыцці ўжо дзейнічае ў дачыненні да 41 летняга лагера, 35 з якіх знаходзяцца ў Мінскай вобласці.

Як паведаміў Сяргей Паланевіч, летась у месцах аздараўлення дзяцей не было дапушчана ніводнага пажару або іншай надзвычайнай сітуацыі. Ён упэўнены, што і зараз усе парушэнні будуць ліквідаваны.

Таццяна ДАРАШЧОНАК.

ГАЗЕТА — ЧЫТАЧЫ

У адказ на блакаду — працягніце «Народнай воле» руку дапамогі!

Скажам шчыра: з дня на дзень мы чакалі адмены рэпрэсій з боку ўлады. Чакалі весткі, што "Народная воля" далей можа друкавацца ў беларускіх друкарнях, свабодна распаўсюджвацца па падпісцы і праз шапікі.

Але на момант адпраўкі нумара ў друк ніхто не патэлефанаваў, ніхто не абрадаваў.

Што ж, шаноўныя чытачы, будзем разам змагацца за вызваленне, за лёс "Народнай волі". У каторы раз паўтараем: пакуль улады не знялі блакаду, дзейнічаем так, як і дзейнічалі — друкуемся ў Смаленску, распаўсюджваем газету ўласнымі сіламі. Хто яшчэ не зрабіў **перадаплату** за чэрвеньскія нумары — калі ласка, зрабіце гэта ў бліжэйшыя дні. З такой просьбай рэдакцыя звяртаецца і да тых, хто запазычыўся, г.зн. у маі атрымліваў газету авансам. Шкада, але, калі Вы не падтрымаеце "Народную волю", нам, паўтараем, давядзецца развітацца.

Дарэчы, ужо можна рабіць **перадаплату** і за другое паўгоддзе. Не маеце магчымасці заплаціць за нумары ўсіх шасці месяцаў — зрабіце **перадаплату** за любы тэрмін: за месяц, два, тры...

Для тых, хто ўпершыню хоча стаць нашым чытачом, патлумачым: аформіць **перадаплату** можна ў любы дзень. Як толькі нам стане вядома, што Вы заплацілі грошы, праз 2—3 дні атрымаеце свежыя нумары газеты. Таму хутчэй у любы філіял "Беларусбанка" альбо на пошту!

Заадно ў чарговы раз паўтараем нашу настойлівую просьбу: агітуйце за "Народную волю" блізкіх, суседзяў, сяброў па працы, вучобе.

А чаму б не аформіць **перадаплату** за будучыя нумары для таго, каго Вы збіраецеся віншаваць з днём народзінаў ці з нейкай іншай нагоды?

Ведаеце людзей, якія з задавальненнем чыталі б "Народную волю", але, на жаль, у іх цяжкае фінансавае становішча? Калі ласка, дапамажыце ім аформіць **перадаплату**, ваша дабрачыннасць адгукнецца шчырай удзячнасцю ў сэрцах тых, каму Вы зрабілі дабро.

Каб аблегчыць вашы клопаты, і сёння друкуем узоры плацежкі і абаненцкай карткі.

Для тых, хто толькі-толькі вырашыў стаць чытачом "Народнай волі", паведамляем: каб зрабіць **перадаплату** за нумары бягучага і наступных месяцаў (можна нават да канца года), **тэрмінова** наведайце любы філіял "Беларусбанка", а там, дзе іх няма, — любое паштовае аддзяленне. Мінчане могуць аператыўна зрабіць **перадаплату** праз рэдакцыйны офіс (вул.Энгельса, 34а) альбо пазваніць па тэлефонах: 206-63-93 ці 206-68-71. Пасля званка да Вас прыйдуць нашыя валанцёры са свежымі нумарамі газеты і дапамогуць аформіць **перадаплату** за любы тэрмін.

Нагадваем: сума **перадаплаты** за месяц ранейшая — **9500** рублёў для індывідуальных чытачоў і **15.000** рублёў для арганізацый, прадпрыемстваў, устаноў, фірм (за тры месяцы адпаведна 28.500 і 45.000 рублёў). Банкаўскія рэквізіты "Народнай волі" такія:

УП "Народная воля": р/р 3012006535014, ААТ "Пріорбанк", ЦБП 113, код 749, УНН 100961759.

Вымушаны і на гэты раз звярнуць увагу на тое, што перасылаць у рэдакцыю трэба не толькі копію плацежнага дакумента, але і запоўненую **АБАНЕНЦКУЮ КАРТКУ,** узор якой друкуем і ў сённяшнім нумары. Зноў жа: запаўняйце выразна, пажадана друкаванымі літарамі. Разумеем: для Вас, шаноўныя чытачы, гэта дадатковыя цяжкасці. Але што зробіш: каб Вы своечасова атрымлівалі газету, мы вымушаны звяртацца з такой просьбай.

Вы — з «Народнай воляй», «Народная воля» — з Вамі!

0402280179
ИЗВЕЩЕНИЕ

ИЧУП «Народная воля»
получатель платежа
«Приорбанк» ОАО ЦБУ 113 г.Минск
наименование банка
Счет получателя 3012006535014 Лицевой счет код 749
УНН* 100961759
(фамилия, имя, отчество, адрес)

Вид платежа			Дата	Сумма
Предоплата за май, июнь, июль, август, сентябрь, октябрь, ноябрь, декабрь 2007 г. (ненужное зачеркнуть)				
Плательщик			Пеня	
			Всего	

Кассир

ИЧУП «Народная воля»
получатель платежа
«Приорбанк» ОАО ЦБУ 113 г.Минск
наименование банка
Счет получателя 3012006535014 Лицевой счет код 749
УНН* 100961759
(фамилия, имя, отчество, адрес)

Вид платежа			Дата	Сумма
Предоплата за май, июнь, июль, август, сентябрь, октябрь, ноябрь, декабрь 2007 г. (ненужное зачеркнуть)				
Плательщик			Пеня	
			Всего	

КВИТАНЦИЯ
Кассир М.П.

* Заполняется только при осуществлении операции по уплате налогов

Абонентская карточка

на номера газеты «Народная воля»
за май, июнь, июль, август, сентябрь, октябрь, ноябрь, декабрь 2007 года
(ненужное зачеркнуть)

Заполняется отчетливо ***печатными буквами и обязательно*** *отправляется в редакцию с* ***копией платежного документа***

фамилия
имя **отч.**
индекс почтового отделения
область
район
название населенного пункта
город, городской поселок, поселок, деревня (нужное — подчеркнуть)
улица
пр-т
переулок *(нужное — подчеркнуть)*
дом *а,б,в,г* **корп.** **кв.**

(Примечание: в случае получения газеты через абонентский ящик обязательно укажите индекс и адрес почтового отделения)

БУДЗЬЦЕ ЗДАРОВЫ!

Двойчы на год

Міністэрствам аховы здароўя Беларусі выданы загад аб новай тактыцы правядзення дыспансерызацыі дзяцей ад 0 да 18 гадоў. Пра гэта паведаміла на прэс-канферэнцыі ў Мінску галоўны педыятр Міністэрства аховы здароўя Наталля Галькевіч.

Паводле яе слоў, новая тактыка прадугледжвае штогадовы двухразовы агляд дзяцей педыятрам і, пры неабходнасці, вузкімі спецыялістамі, што дазволіць у больш раннія тэрміны выявіць нейкую паталогію і даць адпаведныя рэкамендацыі.

Таццяна ДАРАШЧОНАК.

Бой с одуванчиками

Я уже не однажды видела, как в Минске поливают траву каким-то раствором. Зачем это делают? Неужели в городе мало "химии", хоть бы зеленую травку в покое оставили.

Алина Сердюкова.

Оказывается, наша читательница наблюдала, как в Минске ведется борьба с одуванчиками. Газоны действительно обрабатываются специальным химическим раствором.

Как пояснила начальник станции защиты растений УП "Минскзеленстрой" Ольга Безик, активное размножение одуванчиков приводит к вырождению газонов, поэтому с ними нужно бороться. По словам специалиста, скашивание не приносит результата, поэтому самое эффективное средство — обработка специальными химическими препаратами — гербицидами. Обрабатываться газоны будут весь сезон — с середины весны и до конца лета. Как объяснила Ольга Безик, используемые препараты относятся к пониженному классу опасности. Яд действует только на сорняки, а для газонной травы он не опасен. Что касается воздействия на окружающую среду, то, к счастью, эти химические препараты быстро распадаются на невредные вещества.

Игорь МОРОЗОВ.

Адрас рэдакцыі:
220030, Мінск, вул.Энгельса, 34а.
Прыёмная: тэл./факс (017) 206-68-71.
Тэл./факс рэкламнага аддзела: 206-69-04, 206-69-06.
E-mail : nv@promedia.by
http://www.nv-online.info
Індэкс 63222

Заснавальнік і галоўны рэдактар Іосіф СЯРЭДЗІЧ

У сувязі з адсутнасцю магчымасці рэдакцыя матэрыялы не рэцэнзуе і не вяртае, права ўступлення ў перапіску пакідае за сабой. За інфармацыю, размешчаную ў рэкламных аб'явах, рэдакцыя не адказвае. Могуць друкавацца матэрыялы, у якіх пазіцыя аўтараў не падзяляецца газетай.
Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №246 ад 10 кастрычніка 1996 г. (пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі №224 ад 6 сакавіка 2000 г.).
Надрукавана ў ТАА "Типография Михайлова - С", 214020, г.Смаленск, вул. Шаўчэнкі, 86. Па заказе ТАА "Типография Михайлова", 214000, г.Смаленск, вул. Кастрычніцкай рэвалюцыі, д.38, кв.54. Падпісаны ў друк 6.06.2007 у 16.00. Аб'ём 4 друк. аркушы. Тыраж: 11 000 экз. Заказ №